Л. М. Несцярчук

# ПАЛАЦЫ, ПАРКІ, ЗАМКІ
# Баранавіцкага раёна

## Гісторыя, стан, перспектывы

Kamunikat.org

Брэст, аблдрукарня. 1999

УДК 72 (476.7)
ББК 85.113 (2Б - 4Бр)
Н 56

Рэцэнзент: Кафедра фізічнай геаграфіі і аховы прыроды
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэту

Несцярчук Л.М.,
кандыдат гістарычных навук

Н 56 ПАЛАЦЫ, паркі, замкі
Баранавіцкага раёна.
Гісторыя, стан, перспектывы - Брэст: абдрукарня, 1999 - 80 с.

ISBN 985-6413-29-X

Ілюстраванае навукова-папулярнае выданне «Палацы, паркі, замкі Баранавіцкага раёна» з серыі «Архітэктурная спадчына Берасцейшчыны» закранае праблемы гісторыі, стану, аднаўлення, выкарыстання і папулярызацыі палацаў, паркаў, сядзіб і замкаў на тэрыторыі сучаснага Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы.

Кніга рэкамендуецца работнікам культуры, адукацыі і аховы прыроды, даследчыкам і прыхільнікам аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны.

ББК 85.113 (2Б - 4Бр)

© OCR: Камунікат.org, 2018
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2018
© PDF: Камунікат.org, 2018

© Л. М. Несцярчук, 1999
© Брэсцкая абласная
друкарня, 1999

ISBN 985-6413-29-X

# Змест


**Карта-схема размяшчэння гістарычных палацаў, паркаў, сядзіб і замкаў...... 4**
**Прадмова аўтара ...... 5**
**Шляхам палаца - паркавых ансамбляў...... 10**
**Бурдукаўшчына (Буйнявічы)...... 10**
**Вольна ...... 12**
**Гарадзішча...... 14**
**Дамашэвічы...... 15**
**Жалезніца...... 17**
**Завоссе ...... 19**
**Зад вея ...... 22**
**Ішкальдзь ...... 24**
**Калдычэва...... 26**
**Крапівін ...... 28**
**Кутаўшчына ...... 31**
**Лазаўцы ...... 32**
**Лесіна...... 34**
**Люшнева...... 35**
**Новая Мыш...... 37**
**Старая Мыш...... 39**
**Падлясейкі ...... 41**
**Паланэчка...... 42**
**Паўлінава ...... 46**
**Савічы ...... 48**
**Сачыўкі ...... 51**
**Вялікая Сваротва ...... 53**
**Стайкі ...... 55**
**Развадова (г.Баранавічы)...... 57**
**Стары парк (г.Баранавічы)...... 58**
**Вялікае Сяло...... 59**
**Трацэвічы ...... 60**
**Туганавічы ...... 62**
**Верхняе і Ніжняе Чэрніхава...... 66**
**Нстрэмбель ...... 67**
**Ясянец ...... 70**
**Заключэнне...... 72**
**Імянны паказальнік ...... 73**
**Вібліяграфія ...... 75**
**Пра аўтара ...... 77**

**Карта-схема**
**размяшчэння гістарычных палацаў,**
**паркаў, сядзіб і замкаў на тэрыторыі**
**Баранавіцкага раёна**




Kamunikat.org

# Прадмова аўтара

Баранавіцкая зямля адрозніваласся некалі мноствам гістарычных палацаў, паркаў, сядзіб і замкаў, славілася знакамітымі асобамі.

Шэраг сядзіб былі ў свой час радзіннымі гнёздамі выбітных прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. Гэтая зямля дала свету таленавітага паэта і грамадскага дзеяча Андрэя Рымшу (Пянчын), публіцыста і дзяржаўнага дзеяча Мацея Радзівіла (Паланэчка), геніяльнага паэта Адама Міцкевіча (Завоссе), выдатнага дзеяча культуры і асветы, апошняга канцлера ВКЛ Яўхіма Храптовіча (Ясянец), скульптара Рафаіла Слізеня (Вольна), народнага майстра і паэта Паўлюка Багрыма (Крашын), тэатральнага дзеяча Уладзіслава Галубка (ст.Лясная) і многіх іншых.

На працягу шматвяковай гісторыі Беларусі паслядоўна пашыралася тут разнастайнасць палацаў, паркаў і сядзіб, якіх да II сусветнай вайны налічвалася больш за 100, мянялася іх роля і архітэктурнае аблічча, культура і хараство ў адпаведнасці з запатрабаваннем часу.

Гэта не выпадкова, таму што стваральнікамі гэтых унікальных асяродкаў беларускай культуры былі таленавітыя дойліды і майстры, а фундатарамі і гаспадарамі з'яўляліся заможныя і інтэлігентныя людзі, выхаваныя, безумоўна, у лепшых традыцыях еўрапейскай культуры, грамадзянскай свядомасці і шляхецкага менталітэту.

Палацы, паркі і сядзібы, як і людзі, нараджаліся, раслі і жылі, часам доўга, а часам заўчасна і раптоўна паміралі ў ваенных ліхалеццях.

Ды не толькі ў пажарах войнаў гінулі шэдэўры палацапаркавай спадчыны, але і ў мірныя часы, часы рэвалюцыйна-

га запалу і атэістычнага вандалізму, бездухоўнага прагматызму і прафесійнай некампетэнтнасці і, нарэшце, злачыннай безгаспадарчасці.

У выніку бязлітасных адносін большасць гістарычных палацаў, паркаў і сядзіб беззваротна зніклі, а тыя некалькі дзесяткаў, што засталіся, прадстаўляюць сабою рудыменты, руіны, падмуркі і рэшткі некалі квітнеючых ансамбляў. Але нават разбураныя, паўразбураныя і занядбаныя, гэтыя аб'екты прадстаўляюць не толькі значны навуковы і пазнавальны інтарэс, але маюць велізарнае значэнне ў патрыятычным выхаванні моладзі, усяго насельніцтва.

Таму Брэсцкім аблвыканкамам зроблены першы, але даволі важкі крок у кірунку аднаўлення палаца-паркавых ансамбляў. Па ініцыятыве старшыні аблвыканкама Уладзіміра Заламая прынята спецыяльнае рашэнне абласнога выканаўчага камітэта аб рэстаўрацыі на першым этапе па аднаму гістарычнаму парку ў кожным раёне, запланавана на перспектыву стварэнне ў адноўленых гістарычных палацах шэрагу арыгінальных музеяў.

Разгортваецца работа вакол гэтай праблемы і ў Баранавіцкім раёне.

Тут пры актыўнай падтрымцы абласных і рэспубліканскіх органаў улады адноўлена радзіннае гняздо Адама Міцкевіча - фальварак Завоссе, у якім адчынены Дом-музей знакамітага паэта, пачата рэстаўрацыя асобных гістарычных палацаў (Паланэчка, Ястрэмбель і інш.), праектуецца аднаўленне Туганавіцкага парку.

У апошнія гады па ініцыятыве актывістаў нацыянальна-культурнага адраджэння на тэрыторыі раёна адчынена шэраг мемарыяльных знакаў, дастойна ўшаноўваюцца імёны выбітных асоб і гістарычныя падзеі.

Прадстаўленая чытачу кніга - гэта спроба ў пэўнай меры ўзнавіць страчаную прыгажосць, раскрыць новыя старонкі гісторыі палаца-паркавага мастацтва, аказаць інфармацыйную і метадычную дапамогу мясцовым уладам, падтрымаць тых прыхільнікаў аднаўлення спадчыны, якія застаюцца

нераўнадушнымі да яе лёсу і прымаюць асабісты ўдзел у гэтай святой справе.

Вынікі даследавання (сучасны стан палацаў і паркаў, біяграфічныя звесткі, схемы, малюнкі, фотаілюстрацыі), якія ўвайшлі у кнігу, падрыхтаваны на падставе вывучэння матэрыялаў дзяржаўных архіваў гг.Мінска, Дзяржынска, Гродна, Брэста, музеяў Брэста і Баранавіч, дзяржаўных архіваў Масквы, Варшавы і Кракава, а таксама шэрагу прац, у першую чаргу, беларускіх вучоных (архітэктараў, гісторыкаў, батанікаў, географаў, археолагаў) Анатоля Федарука, Міхася Ткачова, Алега Трусава, Тамары Габрусь, Анатоля Кулагіна, Адама Мальдзіса, Юрыя Чантурыя, Юрыя Якімовіча, Васіля Анціпава, Анатоля Грыцкевіча, польскіх даследчыкаў палаца-паркавага мастацтва Рамана Афтаназы, Аліны Ваўрынчык, Рыгора Ракоўскага і іншых.

У працы выкарыстаны рэпрадукцыі і фотакопіі малюнкаў і фотаздымкаў знакамітых мастакоў і фотамайстроў XIX - XX ст. Н.Орды, А.Кулешы, Ю.Пешкі, У.Дмахоўскага, Я.Булгака, Т.Барэцці, К. Карповіча, Падбельскага, Я.Косака, Фабіянскага і інш., фотакарткі з рэспубліканскага архіву кінафотадакументаў.

У прапанаваным гісторыка-архітэктурным нарысе асноўная ўвага ўдзяляецца гісторыі стварэння палацаў, паркаў, сядзіб і замкаў Баранавіцкага рэгіёну, іх лёсу, сучаснаму становішчу і перспектыве іх аднаўлення.

# Предисловие автора

Барановичская земля отличалась некогда множеством исторических дворцов, парков, усадеб и замков, славилась знаменитыми личностями.

Ряд усадеб были в свое время родовыми гнёздами известных представителей белорусской интеллигенции. Эта земля дала свету талантливого поэта и общественного деятеля Андрея Римшу (Пянчин), публициста и общественного деятеля ВКЛ Матея Радзивилла (Полонечка), гениального по-

эта Адама Мицкевича (Заосье), выдающегося деятеля культуры и просвещения, последнего канцлера ВКЛ Иоахима Хрептовича (Ясенец), скульптора Рафаила Слизеня (Вольно), народного мастера и поэта Павлюка Багрима (Крошин), театрального деятеля Владислава Голубка (ст. Лесная) и многих других.

На протяжении многовековой истории Беларуси последовательно расширялось здесь разнообразие дворцов, парков и усадеб, которых до II мировой войны насчитывалось более 100, менялась их роль и архитектурный облик в соответствии с велением времени.

Это не случайно, потому что создателями этих уникальных центров белорусской культуры были талантливые зодчие и мастера, а их собственниками являлись достаточно обеспеченные и интеллигентные люди, воспитанные, безусловно, в лучших традициях европейской культуры, гражданской сознательности и шляхетского менталитета.

Время не пощадило шедевры дворцово-парковой архитектуры, большинство из них погибло в военных лихолетиях и во времена революционного запала, атеистического вандализма и бездуховного прагматизма, профессиональной некомпетентности и преступной бесхозяйственности.

В настоящее время в Брестской области начался процесс возрождения ряда исторических парков и усадеб.

По инициативе председателя облисполкома Владимира Заломая принято специальное решение областного исполнительного комитета о восстановлении на первом этапе по одному историческому парку в каждом районе.

Постепенно разворачивается работа вокруг этой проблемы в Барановичском районе. Здесь при активной поддержке и помощи областных и республиканских органов власти восстановлено родовое гнездо Адама Мицкевича - фольфарок Заосье, началась реставрация отдельных исторических дворцов (Полонечка, Ястрембель и др.), проектируется восстановление Тугановичского парка.

В предлагаемой книге основное внимание уделяется

истории создания дворцов, парков, усадеб и замков Барановичского региона, их судьбам, современному состоянию и перспективе восстановления.

## Przedmowa autora

Ziemia Baranowicka wyróżniała się niegdyś mnóstwem pałaców, zamków, parków i zabudowań dworskich, słynęła się znakomitymi postaciami.

Wiele majątków było w swoim czasie rodowymi siedzibami słynnych przedstawicieli białoruskiej inteligencji.

Ziemia ta dała światu utalentowanego poetę i społecznika Andrzeja Rymszę (Pianczin), publicystę i społecznika W.K.Lit. Macieja Radziwiłła (Połoneczka), genialnego poetę Adama Mickiewicza (Zaosie), wybitnego działacza kultury i oświaty, ostatniego kanclerza W.K.Lit. Joachima Chreptowicza (Jasieniec), rzeźbiarza Rafała Śliźnia (Wolna), twórcę ludowego i poetę Pawła Bagrima (Kroszyn), działacza teatralnego Władysława Gołąbka (St. kol. Leśna) oraz wielu innych.

W ciągu wielowiekowej historii Białorusi powstało wiele różnorodnych pałaców, parków i zabudowań. Z nich do II wojny światowej zachowało się ponad sto obiektów. Wraz z upływem czasu zmieniała się ich rola i architektura.

Ich bogactwo było niezwykłe, ponieważ budowniczymi tych unikalnych ośrodków białoruskiej kultury byli utalentowani architekci i rzemieślnicy, a ich właścicielami byli ludzie inteligentni, posiadający zapewniony byt materialny, wykształceni w lepszych tradycjach europejskiej kultury, społecznikowstwa i mentalności szlacheckiej.

Czas nie oszczędził architektury pałacowo - parkowej, większość z niech obróciło się w niwecz w ciężkich latach wojny i w czasie rewolucyjnego uniesienia, ateistycznego wandalizmu i bezdusznego pragmatyzmu, profesjonalnej niekompetencji i przestępczej niegospodarności.

W ostatnich latach w Okręgu Brzeskim rozpoczął się proces wskrzeszania szeregu parków i zabudowań.

W przedstawionej książce zasadniczą uwagę poświęcono historii budowy pałaców, parków; zabudowań i zamków Okręgu Baranowickiego, ich losów, stanu aktualnego i perspektyw odbudowy.

# Шляхам гістарычных палаца - паркавых ансамбляў Баранавіцкага рэгіёну Брэстчыны

Палаца-паркавы ансамбль у свой час прадстаўляў сабой высокамастацкі комплекс кампазіцыйна і арганічна звязаных архітэктурных і прыродных элементаў (палаца, парку, афіцыны, флігеляў, аранжарэяў, капліцы-пахавальні альбо фамільнага склепу, сажалак, каналаў, вытворчых і гаспадарчых збудаванняў і іншых аб’ектаў), характэрных для розных перыядаў колькасцю і разнастайнасцю ў стылі, мастацтве і творчасці.

Гісторыя, сучасны стан і перспектывы ансамбляў (маёнткаў, сядзіб, фальваркаў і замкаў) падаюцца аўтарам разам са звесткамі аб жыцці і дзейнасці іх колішніх гаспадароў, стваральнікаў і фундатараў.

## Бурдукаўшчына (Буйнавічы) Burdykowszczyzna Бурдуковщина

Палаца-паркавы ансамбль. Размяшчаўся паміж вв.Застарынне і Пачапава ва ўрочышчы Бурдукаўшчына.[1] На сённяшні час захаваліся толькі рэшткі раскошнага некалі англійскага парка, у т.л. трапляюцца добра захаваныя дрэвы вярбы ломкай шаравіднай, караганы і алычы[2].

Сядзіба вядомая з 1826 года, як уласнасць Ганны Валадкевіч з даволі знатнага роду Абуховічаў на Беларусі з-пад Мазыра. Наступная ўласніца маёнтку Рэгіна Абуховіч выйшла за мужа з роду Эйсмонтаў. С гэтага часу і да канца XIX - пачатку XX ст. двор Бурдукаўшчына належаў роду Эйсмонтаў[3].



***Мал. I. Бурдукаўшчына. Від на палац з боку парку у 1876г. Фотакопія арыгіналу акварэлі Напалеона Орды.[4]***

Дакладная дата пабудовы палаца невядома, але, мяркуючы па архітэктурным аблічччы і стылі ён, верагодна, узнесены напрыканцы 18 ст. Будынак цагляны, двухпавярховы, прамавугольны ў плане, меў два сіметрычна размешчаныя па бакам крылы з парай комінаў на кожным.

На акварэлі Напалеона Орды з боку парку цэнтральны корпус палаца выдзяляецца трохвосевым рызалітам з тэрасай на першым паверсе і балконам на другім паверсе. Аблічча фасаду з цэнтральнага ўваходу і ўнутраная аздоба будынку невядомыя.

Палац быў разбураны ў паваенны час.

[1] *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1477, воп. I, спр. 1929, арк. 1-4.*

[2]*Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989, с.182.*

[3] *Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych Kresach Rzeczypospolitej.T.2. Wroc/aw, 1993, s.192.*

[4] *Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (Ш - RA. 4554).*

# Вольна
# Wolna
# Вольно

Сядзіба вядомая па інвентары 1571г. Уключала двор, дварок, гумнішча і абору. У склад двара ўваходзілі 4 жылыя дамы, 2 піўніцы, канюшня на 20 коней, шэраг свіранаў. Усе 4 жылыя дамы мелі па 1-2 святліцы, каморы, сені, прыбіральні, ганкі. Па-за тэрыторыяй двара стаялі будынкі бані, пякарні, піўнога бровару.

Пры двары меліся два сады і рыбная сажалка. Такім чынам, ужо ў 16 ст. Вольнаўская сядзіба мела функцыянальна раздзеленую архітэктурна-планіровачную структуру[1].

Пазней, у 17 ст. у Вольна ўзнікае палаца-паркавы ансамбль. Да сённяшняга часу захаваліся рэшткі пейзажнага парку ў выглядзе асобных фрагментаў, але прыцягвае ўвагу даволі вялікая сажалка плошчай каля аднаго гектару з вялікім выцягнутым востравам. Сажалка абсаджана вакол узбярэжжа вярбой ломкай шараванай[2].

Сядзіба і вёска Вольна ў 17 ет. належалі шляхетнаму роду Каменскіх. У 1632 годзе стольнік Навагрудскі Крыштоф Каменскі разам з жонкаю Аленай з княжацкага роду Друцкіх-Горскіх сталі фундатарамі мураванай царквы ў м.Вольна, пры якой адчынілі ордэн базіліянаў. Ад Каменскіх маёнтак перайшоў да сям'і Чацвярцінскіх, затым яго набыў Ян Слізень з лініі Ашмянскіх. Сын Яна - Рафаіл Слізень (1804 - 1881) быў выбітным архітэктарам і скульптарам, аўтарам медальёнаў і помнікаў-бюстаў Томашу Зану, Адаму Міцкевічу, Ігнату Дамейку і іншым славутым людзям. Рафаіл быў у шлюбе з Камілай з багатага роду Тышкевічаў, меў 4 сыны і дзве дачкі. Маёнтак Вольна перайшоў па спадчыне малодшаму сыну Генрыху, які ажаніўся з Нінаю Маўросавай, дачкою асабістага ад'ютанта ген. Мураўёва, гарачай прыхільніцаю і патрыёткаю нацыянальнага адраджэння. Пасля Генрыха двор Вольна перайшоў да яго пляменніка Валь-

дэмара Слізеня, а апошняй уласніцай Вольнай стала яго дачка Іза Слізень (нарадзілася ў 1915г.)[3].

Вольнаўскі мадэрновы палац быў закладзены яшчэ ў 17 ст. у найлепшых традыцыях еўрапейскага дойлідства. У першай палове 19 ст. перабудаваны ў стылі моднай на той час неаготыкі і стаў значна вышэйшы і шырэйшы. Асаблівую прыгажосць надавалі будынку шасцівугольныя вежкі са стогападобным дахам. Тыльны выхад з палацу прадстаўляў сабою доўгую тэрасу са сходкамі да парку.



***Мал. 2. Вольна. Агульны, выгляд палацу да 1939г.[4]***

Сцены знадворку былі ашаляваны гладкімі дошкамі і пакрыты светлымі фарбамі, а вежкі атынкаваны. Палац меў трохсхільны гонтавы дах. Адна частка будынку была занятая невялікімі жылымі пакоямі, другая - парай вялікіх пакояў, адзін з якіх служыў сталоўкай, другі - гасцёўняй. У сталоўцы вісела прыгожая люстра-жырандоль з белага крышталю, а так званы «ружовы» пакой упрыгожвалі партрэты радні Слізеняў, выкананыя невядомым мастаком.

У левым крыле размяшчаліся два салоны, афармленыя ў стылі ампір. Адна са сценаў першага салону была ўпрыго-

Жана вялікім габеленам з відам Венецыі. Апрача таго, у пакоях вісела шмат карцін Я.Косака, Я.Фалата, І.Рэпіна і інш. мастакоў. Перад 1939г. у палацы існавала багатая бібліятэка польскіх і французскіх кніг, якую Генрых Слізень перад другой сусветнай вайной вывез да Варшавы.
Палац акружаў пейзажны парк у англійскім стылі, які меў плошчу некалькі гектараў. Акрамя ліпавых і каштанавых алеяў, у парку раслі ліпы паасобку і купамі, далей - сосны, дубы, бярозы, ясені і шмат дэкаратыўных кустарнікаў.

Пасля II сусветнай вайны палац быў разбураны.

*[1] Якимович Ю А. Зодчество Белоруссии XVI - середины XVII в. Мн., 1991, с. 75.*
*[2] Федорук А.Т. Садово-парковое искусство..., с.182.*
*[3] Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s.399-400.*
*[4] Ілюстрацыя: тамсама, с. 399.*

# Гарадзішча
# Horodyszcze
# Городище

Гарадское ўмацаванне і колішняя сядзіба. Непадалёку ад пасёлка, ва ўрочышчы Гарадок, на правым беразе р.Сэрвеч размяшчалася ўмацаванае гарадзішча.



*Мал. 3. Сучасны выгляд старадаўняга ў мацавання.'*



kamunikat.org

Авальная пляцоўка памерам 28 х 50 метраў арыентавана з поўдня на поўнач. Уяздныя вароты знаходзіліся з паўночнага боку замчышча. Найбольшыя ўмацаванні існавалі з усходу. Тут пляцоўка ўзвышаецца на 6-7м. Захаваўся роў шырынёй 6-7м і глыбінёй 1,3 - 1,7м.

Даўжыня ўмацаванага ўчастку складае, прыкладна, 200м, шырыня - 130м. На падставе археалагічных знаходак, знешняга выгляду і памераў умацавання Гарадзішчанскае замчышча можна аднесці да эпохі ранняга феадалізму[2].

Некалі ў мястэчку існаваў палаца-паркавы ансамбль. Гарадзішча да 1831 г. належала графу Людвіку Пацу, аднаму з найбольш заможных беларускіх магнатаў. Людвік Пац меў у зарэчанскай частцы даволі раскошную сядзібу[3]. У яе ўваходзілі палац, гаспадарчыя збудаванні, млын, малатарня, сад і маляўнічы парк. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1831 г. маёнтак быў канфіскаваны і перададзены царскім урадам расійскім землеўладальнікам, а мураваны касцёл (1640г.) перабудаваны ў 1864г. пад праваслаўную царкву. На сёння ад палаца і парку практычна ўжо нічога не засталося.

1 *Фота аўтара. 1999 г..*

2 *Свод памятников..., с. 94.*

3 *Тамсама, с. 93.*

# Дамашэвічы
# Domaszewicze
# Домашевичи

Сядзібна-паркавы ансамбль у Дамашэвічах, як адзначае польскі даследчык Раман Афтаназы, належаў зямельным уласнікам сярэдняга дабрабыту, якіх на тэрыторыі сучаснай Беларусі было вельмі шмат.

У першай палове 19 ст. маёнтак быў спадчынай роду Корбутаў гербу Карчак, які меў неафіцыйнае прозвішча Карафа з урочышча «Сядлішча».[1]

Род быў вельмі старадаўні і паходзіў сваімі каранямі з-пад Хелму, адкуль распаўсюдзіўся і асеў на Беларусі.



***Мал. 4. Дамашэвічы. Выгляд палаца ад фронту ў 1915г.[2]***

У другой палове 19 ст. Дамашэвічы, верагодна па жаночай лініі, перайшлі да мала знаёмага роду Леяў, таму што яго паходжанне амаль невядомае. Магчыма, ад яго паходзіў у другой палове 18 ст. каралеўскі ад'ютант Караль Лей, які пасля сябе не пакінуў нашчадкаў.



***Мал. 5. Дамашэвічы. Сучасны выгляд парку.[3]***



Kamunikat.org

У першай палове 19 ст. у Дамашэвічах ужо існаваў стары аднапавярховы палац. У архітэктурным плане гэта быў прамавугольны будынак з высокім і гладкім чатырохсхільным дахам, накрытым гонтаю, з чатырма сіметрычна размешчанымі комінамі. З боку пад’езду быў прыбудаваны масіўны порцік на дзвюх парах калонаў з трохкутным невялікім шчытком.

Унутраны выгляд палацу невядомы. Перад палацам размяшчаўся газон, акружаны падстрыжаным жываплотам. Двор з усіх бакоў ахінаў вялікі парк, перасечаны па восі працяглай уязднoй алеяй. Палац не захаваўся. Застаўся парк плошчай каля 5 гектараў з унікальным дрэвастоем, у асноўным з дрэваў мясцовых парод. Парк патрабуе ўзяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы.

[1] *Aftanazy R. Dzieje rezydencji ... s. 201.*

[2] *Ілюстрацыя: тамсама, с.201.*

[3] *Фота аўтара. 1999 г.*

## Жалезніца
## Żeleżnica
## Железница

Старадаўняя сядзіба, размешчаная над р.Мышанкай. Маёнтак спачатку належаў роду Завішаў, потым Вольскіх.[1] Побач з дваром існаваў касцёл, пазней перабудаваны пад праваслаўную царкву, якая была знішчана пасля другой сусветнай вайны.

На месцы сядзібы ў паваенны час існавала школа (зачынена). Палац не захаваўся. З колішніх збудаванняў сядзібы дасталіся рэшткі дваровай сыраварні.

Напачатку XX стагоддзя ў перыяд правядзення хутарызацыі маёнтак Вольскіх быў падзелены і распрадады. Засталіся рэшткі некалі раскошнага парку (каля 7 га), захавалася ўнікальная ўяздная алея з канадскіх векавых таполяў. Побач знаходзяцца руіны капліцы-пахавальні арыгінальнай архітэктуры. Яе будынак ў плане квадратны нясе элементы класіцызму.



*Мал. в. Жалезніца. Уяздная алея.*
*Удалечыні капліца-пахавальня.~*

Уваход вылучаны порцікам на чатырох масіўных калонах, які завершаны трохкутным шчытком. Унутры капліцы існавала некалькі склепаванняў (разрабаваныя і разбураныя).



*Мал. 7. Жалезніца. Рэшткі сыраварні.*[3]



*Мал. 8. Жалезніца. Руіны капліцы-пахавальні.*[4]

Капліца і рэшткі парку патрабуюць узяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы.

1 *Słownik Geograficzny... T. 14. Warszawa, 1890, s. 768.*

2*Фота аўтара. 1999г.*

## Завоссе
## Zaosie
## Заосье

Фальварак размяшчаўся каля в.Завоссе, у якім 24.12.1798г. нарадзіўся знакаміты паэт і выбітны дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху Адам Міцкевіч.

Бацькі Адама Міцкевіча атрымалі частку фальварку Завоссе напрыканцы 1799г. і пражылі ў ім да 1801г. У бацькавай сядзібе Адам Міцкевіч правёў амаль два гады дзяцінства, а пасля ў сталым узросце даволі часта наведваў родныя мясціны.



***Мал. 9. Фальварак Завоссе ў 1876г.***

***Фотакопія з літаграфіі акварэлі Напалеона Орды.***[1]

Згодна з легендаю, якая бытуе сярод мясцовага насельніцтва, на адным з камняў, які і зараз ляжыць каля хутара, Адам Міцкевіч выбіў крыж, як успамін аб сваім няспраўджаным каханні да Марылі Верашчакі.[2]

У 1927г. на месцы колішняга фальварку Завоссе вайсковым падраздзяленнем з Баранавіч усталяваны помнік паэту[3] (аднаўлены ў 1955г.). Пры рэканструкцыі музея-сядзібы Адама Міцкевіча ў 1998г. ён быў знесены.

Знакамітая Завосеўская сядзіба знайшла адлюстраванне ў мастацкіх творах таленавітых мастакоў-суайчыннікаў Н.Орды, Е.Паўловіча, Т.Абміньскага.

Сядзіба адносілася да дробнапамеснага роду і ўяўляла сабою традыцыйны фальварак з наборам драўляных пабудоў, у які ўваходзілі гаспадарскі дамок, лямус, свіран. Жылы дом меў звычайную архітэктуру, працяглы па фронту зруб з нешаляванымі сценамі, накрыты саламяным вальмавым дахам. Па цэнтры ён меў ганак на двух слупах і складаўся з дзвюх палавінаў.

Лямус - гэта традыцыйная сялянская пабудова для захавання збожжа, харчу, прылад, іншых гаспадарчых рэчаў. Будынак уяўляў сабою звычайны двухярусны зруб пад вальмавым дахам.

Уся сядзіба была акружана жардзінным плотам.

На сённяшні дзень з часоў паэта захаваліся толькі старая без верхавіны ліпа ды невялікая сажалка.



***Мал. 10. Завоссе. Від на адноўлены фальварак. На пярэднім плане рэшткі старой ліпы - равесніцы часоў Адама Міцкевіча.[4]***

У 1998 г. колішні фальварак поўнасцю рэканструяваны і ў ім адчынены і працуе музей-сядзіба Адама Міцкевіча.

[1] *Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (Zbiory rysunków).*

[2] *Страчаная спадчына /Габрусь Т., Кулагін А., Чантурыя Ю., Квітніцкая А., Ткачоў М. - Мн., 1998, с.201.*

[3] *Rąkowski G. Ilustrowany przewodnik po zabytkach kultury na Białorusi. Warszawa, 1997, s.279.*

[4] *Фота аўтара. 1998г.*

# Задвея
# Zadwieja
# Задвея

Як сцвярджае польскі даследчык Раман Афтаназы, палаца-паркавы ансамбль у Задвеі існаваў у 18 ст. Паводле шэрагу іншых крыніц, Задвейская сядзіба ўзнікла значна раней і належала спачатку да роду Межаеўскіх. Менавіта з гэтага роду паходзіць удзельнік Напалеонаўскай кампаніі, кавалерыйскі капітан Мацей Межаеўскі, які за храбрасць пры ўзяцці Самасеры заслужыў асабістую павагу Напалеона. Яго партрэт (у ваеннай форме на кані) невядомага мастака да другой сусветнай вайны захоўваўся ў Задвейскім палацы, а мундзір з ардэнамі Віртуці Мілітары і Ганаровага Легіёну яшчэ ў 1890 годзе быў перададзены музею Любамірскіх у Львове.

Унучка Мацея Межаеўскага ў 1891 годзе выйшла замуж за Ігнацыя Чачота і з гэтай пары да 1939 года Задвейская сядзіба знаходзілася ва ўласнасці роду Чачотаў[1].



***Мал. 11. Задвея. Выгляд палаца ад фронту да 1939г.[2]***

У першай палове 18 ст. у Задвеі быў пабудаваны драўляны палацык, у якім нарадзіўся Мацей Межаеўскі. Пасля

вяртання з Напалеонаўскай вайны ён значна палепшыў будынак, дабудаваў перад цэнтральным ўваходам ганак на чатырох калонах, а з боку парку ў сярэдняй частцы будынку - мураваную сцяну ў форме псеўдарызаліту, дэкарыраваную чатырма прыгожымі пілястрамі і трохвугольнымі падзаконнымі вальмамі.

Напачатку 20 ст. да сярэдняй часткі муараванай сцяны была дабудавана шырокая цагляная тэраса з балюстрадай. Падобна як шчыток ганку, так і цэлы будынак палаца быў апаясаны высокім карнізам на кансолях. Палац у плане прамавугольны, меў чатырохсхільны гонтавы дах.

Унутраны выгляд палаца адрозніваўся прастатой аздобы. Яго сцены былі афарбаваны ў белы колер, падлога пакрыта макам, толькі тры парадныя пакоі мелі паркет ў форме вялікіх квадратаў. Апрача двух камінаў, у пакоях існавалі печкі з каляровай кафлі. Салон быў мэбляваны ў стылі ампір.

Перад цэнтральным і дваровым пад'ездамі былі разбіты шырокія газоны і клумбы з кветкамі.



***Мал. 12. Задвея. Выгляд палаца з боку парку да 1939г.[3]***

Палац з усіх бакоў акружаў даволі вялікі парк з векавымі (па 150 гадоў) лісцёвымі і хвойнымі пародамі дрэ-

ваў і старадаўняй каштанавай алеяй. Была, таксама, бярозавая алея разам з ліпавымі шпалерамі. У межах парку стаяла лядоўня, якая па архітэктуры нагадвала капліцу[4].

У сучасны момант усе збудаванні палаца-паркавага ансамбля зніклі, засталіся толькі малыя рэшткі некалі прыгожага парку.

*[1] Aftanazy R. Dzieje rezydencji.... s.409.*
*[2-3] Ілюстрацыі: тамсама.*
*[4] Тамсама, s. 410.*

# Ішкальдзь
# Iszkołdż
# Ишкольдь

Старадаўняя сядзіба. Была вядома па інвентарах 16-17 ет. У той час сядзіба ўключала двор, дворык і гумнішча. Двор меў двое крытых варот з веснічкамі: адна - да касцёлу, другая - да дворыка. Левы бок сядзібы ўключаў два жылыя дамы, кухню, два свіраны, бровар, саладоўню. Супроцьлеглы бок меў трэці жылы дом і мураваны склеп[1].

Галоўны жылы дом называўся «Домам вялікім» і ўяўляў сабою традыцыйнае трохкамернае жытло са святліцай і пякарняй, звязанымі праз сені з дзвюма каморкамі.

Другі дом складаўся з сеняў, каморы і курнай хаты.

Трэці дом меў дзве святліцы, а між імі сені. Кухня прадстаўляла сабою невялікую дзвюхкамерную пабудову і складалася са сталовай і святліцы.

Дворык уключаў толькі адну пабудову і трохкамернае жылое памяшканне з грыдняй і клеццю праз сені. Тады ўжо існаваў стары аднакалёсны вадзяны млын, але ён працаваў толькі ўлетку.

Напрыканцы 16 ст. сядзіба была рэканструяваная і стары дом быў знесены, а пабудаваны новы, змянілася планіроўка самога двара, скасаваныя адны вароты, за дваром узведзена баня. Новы дом меў 6 пакояў. У цэнтры змяшчаліся сені і кухня, у левай палове - хата і камора, у правай - хата, камора, прыбіральня.



***Мал. 13. Ішкальдзь. Выгляд сядзібы.***
***Рэканструкцыя па інвентару 1632г.***[2]

Напачатку 17 ст. двор зноў перабудоўваецца, дабаўляюцца канюшня на два кані і новая дзвюхярусная брама з флюгерамі, а каля сажалкі будуецца бровар. Усе збудаванні былі пакрыты драніцай.

У 17 ст. двор в.Ішкальдзь атрымаў тыповую фальварачную структуру з паступовым выдзяленнем панскага двара, прыкметамі фарміравання паркавай гаспадаркі, закладкай рыбнай сажалкі, будаўніцтвам двухкалёснага вадзянога млына. Зачаткі парку складаліся з трох лесапаркавых участкаў пад назвай «гаі»: першы - бярозавы пад балотам, другі яловы каля млына, трэці складаўся з розных парод дрэваў і размяшчаўся пры дарозе да суседняга фальварку Барацін.

Сядзіба Ішкальдзь, магчыма, існавала да I сусветнай вайны, пасля якой пастутова разбуралася. Некалі была спадчынай роду Ілінічаў, потым Радзівілаў і, нарэшце, князёў Вітгенштэйнаў[3].

[1] *Якимович Ю.Л. Зодчество Белоруссии ..., с. 151.*
[2] *Ілюстрацыя: тамсама, с.148.*
[3] *słownik Geograficzny...T.5,1882, s. 308.*

# Калдычэва
# Kołdyczewo
# Колдычево

Калдычэўскі сядзібна-паркавы ансамбль размяшчаўся на адлегласці 5 км ад Завосеўскай сядзібы Адама Міцкевіча. Паэт часта праязджаў праз Калдычэва, часта называў яго наваколіцы «краем вёснаў дзяцінскіх», з замілаваннем успамінаў у сваіх творах пра Калдычэўскае возера. У тыя часы з гэтага возера брала свой пачатак рака Шчара.

Напачатку 19 ст. сядзіба належала да роду Радзівілаў Нясвіжскіх, ад якіх большую частку маёнтку набыў шляхецкі род Трызнаў і па жаночай лініі перадаў яе роду Філіповічаў, затым зноў па жаночай лініі маёнтак з возерам перайшоў да роду Шалевічаў.

У часы нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 г. на Беларусі, у Польшчы і Літве ўласнік Калдычэва Караль Шалевіч стаў кіраўніком паўстанцкіх атрадаў у Навагрудскім ваяводстве, у сувязі з чым маёнтак быў перапісаны на малодшага брата Брацілава. Герб Шалевічаў уяўляў сабою залаты круг, у якім на блакітным полі ўзвышаліся 3 крыжы.

Раней пры Філіповічах у першай палове 19 ст. ў Калдычэве быў узведзены сядзібны дом. Ён месціўся на ладным пагорку каля ракі Шчары. Будынак аднапавярховы, у плане строга прамавугольны, накрыты высокім гладкім чатырохсхільным гонтавым дахам. Характэрнай рысай будынку з'яўлялася наяўнасць трох сенцаў: адны - парадныя, двое - бакавых. Парадныя сені мелі яшчэ ганак на 4 мураваных калонах з трохкутным шчытком.

Знешне сцены не былі атынкаваны, толькі вокны і калоны мелі белы колер.

Сцены знутры былі пакрыты рознакаляровымі шпалерамі, столі гладкія, пакоі мэбляваныя, у асноўным, мясцовымі майстрамі, на сценах віселі партрэты Філіповічаў і Шалевічаў ды іх радні.



Kamunikat.org



***Мал. 14. Калдычэва.***
***Выгляд сядзібнага дома ад фронту каля 1914г.***[1]

На правым баку асноўнага будынку стаяла аднапавярховая мураваная афіцына на 6 калонах, трохі старэйшая, чым сам жылы дом, магчыма, з Радзівілаўскіх часін.

Перад галоўным будынкам былі разбіты прыгожыя газоны, якія спускаліся ўніз да русла Шчары.

Сядзібу акружаў старадаўні пейзажны парк, у якім раслі векавыя дубы, каштаны, бярозы, ліпы, клёны, дэкаратыўныя кустарнікі. Пад'язднаяя дарога з Навагрудскага тракту цягнулася праз мост на Шчары. Каля гэтай дарогі на пагорку меліся могілкі з пахаваннямі паўстанцаў 1863 г.[2]

У першую сусветную вайну сядзіба была поўнасцю разбурана, апынуўшыся ў зоне фронту паміж нямецкімі і расійскімі войскамі.

У канцы 1918г. была распачата адбудова сядзібы, а ўсе, хто застаўся без даху, жылі тады ў нямецкіх бліндажах.

Адноўлены палац зноў быў знішчаны падчас ваенных дзеянняў паміж буржуазнай Польшчай і савецкай Расіяй у 1919 - 20-х гадах. Паступова маёнтак пачаў распрадавацца і драбнець.

Апошнім уласнікам Калдычэўскай сядзібы да 1932 г.

быў Томаш Шалевіч, сын Бранiслава i Аляксандры, жанаты з Аленай Брахоўскай. Ён лічыўся вельмі руплівым і эканомным гаспадаром. Яго матуля ў ваенныя часы тайна вяла навучанне дзяцей і лячэнне хворых людзей з усіх наваколіц Калдычэва.

*[1]Ілюстрацыя: Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s. 227.*

*[2]Przewodnik po okolicach mickiewiczowskich i rejtanowskich Ziemi Nowogródzkiej. Baranowicze, 1938, s.19.*

# Крошын
# Kroszyn
# Крошын

Сядзібна-паркавы ансамбль належаў у 18-19 ст. роду Прушынскіх, затым Валовічаў і, нарэшце, Радзівілаў з Паланэчкі. Па спадчыне двор перайшоў да дачкі знакамітага драматурга, кампазітара і грамадскага дзеяча Мацея Радзівіла-Антаніны, замужняй за Казімірам Станіславам Гедройцам-Юрагай. У 1842 г. яе дачка выходзіць замуж за Яўгена Роберта Святаполка-Завадскага і з тых часоў амаль 100 гадоў (да 1939г.) маёнтак знаходзіўся ва ўласнасці роду Святаполкаў-Завадскіх.

Да I сусветнай вайны ў Крашыне існаваў драўляны двухпавярховы палац з венскай, які нагадваў сваёй архітэктурай хутчэй вілу, чым тыповую правінцыйную сядзібу.

Палац быў узведзены ў сярэдзіне 19 ст. на ўзвышшы левага берага р. Шчары. Перад Крашынскім палацам існаваў шырокі двор, на якім збоку стаяла афіцына.

Як сцвярджаюць асобныя крыніцы, у Крашыне быў старадаўні абарончы палац-замак, аб чым яшчэ ў сярэдзіне 19 ст. напаміналі рэшткі валоў, равоў і воднай сістэмы.[1]

Крашынская рэзідэнцыя Святаполкаў-Завадскіх, якія з гонарам лічылі сябе нашчадкамі Рурыкаў і ўжывалі княжацкі тытул, размяшчалася ў вялікім пейзажным парку, дзе раслі старадаўнія дубы, таполі, ліпы, грабы, вольхі, клё



*Мал. 15. Крашын. Фрагмент парку. На пярэднім плане дуб, пасаджаны А.Адынцом і І.Дамейкам у 1884г.*[2]

ны, ясені і лозы. На фоне векавых дрэваў асабліва прывабны выгляд мела раскідзістая вярба, якая атрымала назву «Залатая». Парк з прагулачнымі алеямі і сцежкамі меў плошчу каля 7 га. У паўночнаўсходнім кутку парка размяшчаўся фамільны склеп Юрагаў-Завадскіх.

Палац налічваў 24 залы і пакоі, мастацкую майстэрню, бібліятэку і архіў. У майстэрні часта працаваў сын Яўгена - Пётр (нарадз. у 1847г.), які быў жанаты з Марыяй Радзівіл. Ён быў адукаваны і выдатны майстра, намаляваў для Крашынскага і Юшкевіцкага касцёлаў некалькі абразоў, зрабіў праект хрысцільні (купелі), аставіў шмат іншых прац, сабраў для бібліятэкі каля 2000 тамоў кніг, у т.л. рукапісных.

Да І сусветнай вайны ў маёнтку, акрамя работ Пятра, захоўвалася таксама шмат іншых мастацкіх палотнаў, калекцыя старадаўняй зброі, у т.л. шабля караля Яна Казіміра, фарфор з мясцовых фабрык.

У 1915г. праз тэрыторыю сядзібы пралягала лінія фронту, у выніку чаго палац і двор былі спалены. У міжваенны перыяд уласнікі сядзібы пражывалі ва ўратаванай афіцыне.

У Крашын разам з паэтам Антонам Эдуардам Адынцом у ІІ палове 19 ст. прыязджаў, каб пакланіцца праху

сваіх блізкіх, нацыянальны герой Чылі, прафесар мінералогіі, рэктар Чылійскага універсітэту ў Сант-Яга Ігнат Дамейка, стрыечны брат Марылі Верашчакі, сябра Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Томаша Зана. Імем Ігната Дамейкі названы горны ланцуг у Андах - «Кардыльера Дамейкі», шэраг раслін і мінералаў. Да эміграцыі Дамейка актыўна ўдзельнічаў у нацыянальна-вызваленчым паўстанні на Беларусі. Пад імем «Жэгот» прымаў удзел у дзейнасці таварыства філаматаў. Пад гэтым імем Дамейка ўвасоблены ў паэме Адама Міцкевіча «Дзяды».



*Мал. 16. Крашын. Фрагмент парку.*
*Від на. засыпаны зямлёй фамільны склеп Завадскіх.[3]*

Вядома таксама, што дачка Мацея Радзівіла Антаніна была шчырай сяброўкай Марылі Верашчакі, вяла з ёю вялікую перапіску.

З Крашынам звязаны імёны паэта Паўлюка Багрыма, фалькларыста і этнографа М.Федароўскага і беларускага асветніка ксяндза Магнушэўскага.

На сёняшні дзень часткова захаваўся толькі парк. Магільны склеп Завадскіх у паваенныя гады быў разбураны

і засыпаны зямлёй. Напачатку 1990-х гадоў каля дуба, пасажанага А.Адынцом і І. Дамейкам, усталявана памятная дошка. Парк патрабуе ўзяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы.

1 *Aftanazy R. Dzieje rezydencji...................... s.234.*
2 *Фота М. Берната. 1998г.*

# Кутаўшчына
# Kutowszczyzna
# Кутовщина

Гістарычны сядзібны парк у Кутаўшчыне закладзены прыкладна ў II палове 19 ст. Складаецца з некалькіх прамавугольных баскетаў. Паркавы баскет уяўляе сабою кампактную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, у якую ўваходзяць



***Мал. 17. Кутаўшчына. Фрагмент парку.[1]***

павільёны, скульптуры і іншыя малыя архітэктурныя і культурныя аб'екты. Замкнутыя прасторы баскетаў называліся зялёнымі «кабінетамі» альбо «заламі».

Кутаўшчынскі парк з'уляецца сярэднім па велічыні, мае

плошчу прыкладна 4 гектары. Яшчэ захаваў асобыя элементы кампазіцыйнай формы. Добра прадстаўленыя невялікія баскеты, якія створаны перасячэннем ліпавых алеяў. Старымі ліпавымі дрэвамі была абсаджана ўяздная алея. Дрэвы зараз дасягнулі ўзросту высокай дэкаратыўнасці і спеласці[2]. Палац знішчаны, яго знешні выгляд невядомы. Кутаўшчына некалі належала роду Верашчакаў.[3]

[1] *Фота аўтара. 1999г.*

[2] *Федарук А.Т. Садово-парковое искусство..., с. 62-63.*

[3] *Słownik Geograficzny...T.5, 1884, s. 5.*

# Лазаўцы
# Łozowce
# Лозовцы

Колішні палаца-паркавы ансамбль. Размешчаны непадалёку ад в.Нагорнае на поўнач ад Гарадзішча ва ўроч. Лазаўцы. Некалі сядзіба належала роду Пацаў, затым Маліноўскіх, а напачатку 19 ст. яе набыў Стэфан Давідоўскі гербу Прус. Апошнім гаспадаром сядзібы да 1939г. быў унук Стэфана - Браніслаў Давідоўскі.

Звестак аб гісторыі Лазавецкага палацу маецца вельмі мала. Верагодна, ён быў пабудаваны напрыканцы 18 ст. Асноўны аб'ём драўлянага будынку аднапавярховы, сярэдняя частка палацу мела два паверхі. Дах высокі чатырохсхільны, накрыты гонтаю.

У цэнтры дзевяцівосевага фасаду вылучаны порцік на дзвюх высокіх мураваных калонах з трохкутным шчытком. Магчыма, спачатку порцік быў адкрыты, а пазней перабудаваны ў выглядзе выступаючага па цэнтры рызаліту з галоўным уваходам і двума бакавымі вузкімі вокнамі. На другім паверсе ўсе вокны мелі стрэльчаты выгляд. Сцены палацу былі ашаляваныя гладкімі дошкамі.

Першы паверх палацу меў восем пакояў, другі - два. На другі паверх вяла арыгінальная спіралевідная лесвіца.

Падлога складалася з дошак у выглядзе вялікіх квадратаў, пакрытых лакам, толькі ў салоне падлога мела паркетнае пакрыццё. Ва ўсіх пакоях стаялі печы з белай і зялёнай кафлі.

З правага боку палаца месцілася досыць прыгожая афіцына.

Паводле асобных крыніц, палац быў абрабаваны яшчэ ў I сусветную вайну.[1] Пасля II сусветнай вайны палац быў поўнасцю знішчаны.



*Мал. 18. Лазаўцы. Выгляд палаца ад фронту да 1939г.[2]*

Палац акружаў з трох бакоў вялікі старадаўні парк, які разам з садам меў плошчу каля 10 гектараў.

На партэры двара размяшчаўся раскідзісты газон, да якога вяла доўгая ўяздная дарога, абсажаная векавымі дрэвамі мясцовых парод.

[1]*Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s. 254-255.*

[2] *Ілюстрацыя: тамсама, с.254.*

# Лесіна
# Łesino
# Лесино

Сядзібна-паркавы ансамбль. Належаў дробнаму шляхецкаму роду Бабічаў.[1] Закладзены напрыканцы 19 ст. У сучасны момант яшчэ захаваліся сядзібны дом, гаспадарчыя пабудовы: стайня, свіран, складскія памяшканні.



*Мал. 19. Лесіна. Сучасны выгляд сядзібнага дома.[2]*

Сядзібны дом - аднапавярховы, цагляны, прамавугольны ў плане будынак, меў аднарадную калідорную планіроўку, затым пры савецкай уладзе перабудаваны, у выніку чаго дом атрымаў у сваёй сярэдняй частцы анфіладную арганізацыю. Праз невялікія сенцы можна было трапіць у прыхожую. У доме мелася даволі вялікая бібліятэка, гасцёўня, некалькі жылых памяшканняў, сталоўка.

Дом размяшчаўся пасярэдзіне невялікага парку. Да сяго часу захавалася некалькі колішніх алеяў, якія па-новаму абсаджаны маладымі дрэвамі, у асноўным - ліпамі, таполямі, акацыямі.

У паваенныя часы сядзібна-паркавы ансамбль выключна да 1990 года выкарыстоўваўся пад туберкулёзны дыспансэр, а пасля яго высялення застаўся безгаспадарчым.

Парк пры гаспадарскай падтрымцы мае перспектыву існавання.



*Мал. 20. Лесіна. Рэшткі гаспадарчых збудаванняў.*[3]

[1] *Słownik Geograficzny...T.5,1884, s. 155.*

[2'3] *Фота аўтара. 1998г.*

# Люшнева
# Luszniewo
# Люшнево

Колішні палаца-паркавы ансамбль. Сядзіба некалі была радзінным гняздом распаўсюджанага на Беларусі роду Валовічаў. Дачка апошняга з гэтай лініі гаспадара Казіміра - Марыя Валовіч выйшла замуж за Януша Даманскага. Яны былі апошнімі гаспадарамі сядзібы[1].

Палац быў пабудаваны з дрэва пры Валовічах у 17 ст. На жаль, будынак гэты быў спалены незадоўга да II сусветнай вайны.

Палац прадстаўляў сабою ў плане шырокі прамавугольнік, меў адзін паверх, а па цэнтры двухпавярховы порцік.

Напачатку XX ст. дабудаваны балкон з балюстрадай. Рызаліт акружаў шэраг стройных калонаў. Чатыры калоны былі размешчаны пры сцяне ад фронту, а па дзве - пры бакавых сценах.



*Мал. 21. Люшнева. Выгляд палаца ад фронту да 1936г.*[2]

Дзверы галоўнага ўваходу былі напалову зашклёныя.

Бакавы фасад палаца меў такую самую архітэктуру, як і франтальны. Будынак быў ашаляваны гладкімі дошкамі, размаляваны светлымі фарбамі і накрыты высокім ламаным чатырохсхільным гонтавым дахам з 4 комінамі.

З левага боку палаца быў прыбудаваны цалкам зашклёны зімовы сад.

Унутраная планіроўка дома анфіладная. Пакояў было няшмат, але яны мелі даволі вялікія памеры. З правага боку шырокіх сеняў размяшчалася лесвіца на другі паверх і два



*Мал. 22. Люшнева. Выгляд палаца з боку парку да 1939г.*[3]

пакоі-спальні. З левага боку сеняў існавалі ідэнтычныя пакоі-сталоўкі, за імі салон і выхад да зімовага саду.

Найбольш рэпрэзентатыўна была аформлена зала для баляў, якая мела высокую столь і зашклёныя дзверы з выхадам на тэрасу. На другім паверсе мелася хатняя капліца. На сценах сталоўкі віселі партрэты з роду Валовічаў, у т.л. партрэт аднаго з біскупаў, верагодна - Яўстахія Валовіча.

Паблізу двара месцілася афіцына, пабудаваная ў тым жа стылі, што і палац. Палац акружаў вялікі парк з цяністымі ліпавымі алеямі і альтанкай. У парку раслі таполі, бярозы і іншыя дрэвы мясцовых парод. Над маляўнічай сажалкай навісалі раскідзістыя лозы.

[1] *Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s. 246 248.*
[2] *Ілюстрацыі: тамсама, с.248.*

# Новая Мыш
# Nowa Mysz
# Новая Мышь

Да 16 ст. маёнтак належаў да каралеўскіх уладанняў, потым перайшоў у спадчыну роду Хадкевічаў, Сіняўскіх, Юдзіцкіх, Масальскіх. Апошнім гаспадаром маёнтку быў заможны род Несялоўскіх.[1] Па інвентары 1728 г. у Новай Мышы існаваў даволі вялікі драўляны палац. Збудаваны ён напачатку 18 ст. Перад палацам стаяла манумантальная брама, у першым ярусе якой знаходзілася т. зв. «кардэгра-цыя», а ў другім - жылыя пакоі, акружаныя галерэяй. Брама завяршалася высокім чацвярыковым шатром. Палац уяўляў сабою вялікі крыжовы ў плане будынак, завершаны двухярусным гонтавым дахам, з ганкам на слупах перад уваходам.

Цэнтральную частку палаца складалі вялікія сенцы і сталоўка.

Па баках ад гэтых памяшканняў месцілася 15 пакояў, пярэдняя, пяць гардэробаў. У сярэдняй частцы палацу пад сенцамі і сталоўкай размяшчалася вялікая парадная зала.



*Мал. 23. Новая Мыш. Зруйнаваны гасцінны двор 18 ст.*[2]



*Мал. 24. Новая Мыш. Рэшткі мураванага млына 19 ст.*[3]

Інтэр'еры палаца былі багата ўпрыгожаны, сцены размаляваны, дзверы аздоблены разьбой. У вокнах стаялі алавяныя пераплёты, печы ўпрыгожаны кафляй з выявай гранатавых і зялёных кветак, меліся прыгожа аздобленыя каміны[4].

Палац, верагодна, быў знішчаны ў I сусветную вайну.

[1] *Słownik Geograficzny...T.6,1885, s. 383.*

[2,3]*Фота М.Берната. 1992г.*

[4] *Якімовіч Ю.А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся 17-19 ст. Мн., 1978, с.66.*

# Старая Мыш
# Stara Mysz
# Старая Мышь

Старадаўні каралеўскі замак. Да 16 ст. паселішча Мыш уваходзіла ў склад каралеўскай уласнасці. У 1568г. кароль Польшчы і Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт II Аўгуст падараваў графства Мыш і яго навакольныя землі Яну Хадкевічу за яго баявыя заслугі. Ёсць звесткі, што маёнтак Мыш яшчэ да прыняцця каралеўскага прывілею быў уласнасцю Яна Хадкевіча, а прывілей толькі падцвердзіў права на графства ягонай «дзедзічнай» спадчыны. Як чалавек вайсковы, Хадкевіч пабудаваў у сваім графстве Мыш на правым высокім беразе р. Мышанкі па ўсіх правілах ваеннага фартыфікацыйнага мастацтва даволі вялікі замак. Ён узвышаўся над рачной далінай больш чым на 20 м. Замак акружаў з трох бакоў земляны вал шырынёй каля 15 м і вышынёй да 4м. З боку рэчкі валу не было, адсюль замак прыкрываўся балоцістым берагам са стройным схілам.

З трох бакоў перад замкам размяшчаўся велізарны роў 15 м глыбіні і 30 м шырыні. У паўднёвай кутку замкавага двара існаваў калодзеж, ад якога яшчэ захавалася паглыбленне. За ровам з поўдню размяшчалася паселішча Мыш.

Замак Мышы меў валенае ваенна-стратэгічнае значэн-



*Мал. 25. Сучасны выгляд руінаў каралеўскага замка.*[1]



*Мал. 26. Схема планіроўкі рэшткаў каралеўскага замка.*[2]

не, знаходзіўся на шляху з Варшавы на Маскву. Гэта быў традыцыйны феадальны замак на Беларусі, які выконваў ролю магнацкай рэзідэнцыі і агульнай абароны ад ворагаў.

Да сярэдзіны 17 ст. замак вытрымліваў шматразовыя аблогі войскаў. Летам 1654 г. падчас вайны Маскоўскага царства з Рэччу Паспалітай замак царскімі войскамі быў спалены датла. З таго часу замак ужо ніколі не аднаўляўся.[3]

[1,2] *Ілюстрацыі: Свод памятников..., с. 108.*
[3] *Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991, с. 134-135.*

# Падлясейкі
# Podlasiejki
# Подлесейки

Сядзібна-паркавы ансамбль. Апошнімі гаспадарамі сядзібы да 1939 г. былі нашчадкі роду Сакаловічаў. Пасля II сусветнай вайны і да цяперашняга часу на тэрыторыі ансамбля размяшчаецца мясцовая школа.

Добра захаваўся сядзібны дом. Ён быў пабудаваны ў II палове 19 ст. з дрэва на высокім падмурку. Будынак аднапавярховы, у плане прамавугольны, быў накрыты гладкім гонтавым дахам.

У цэнтры палацу меўся высокі ганак на 2-х драўляных слупах, з правага боку захавалася прыбудоўка.



*Мал. 27. Падлясейкі. Выгляд сядзібнага дома ад фронту.*[1]

Вакол сядзібнага дому размяшчаўся даволі вялікі парк, у якім была сажалка, гаспадарчыя пабудовы, фамільны склеп

(не захаваўся). Зараз плошча парку складае прыкладна 5 га. Засталіся рэшткі ўяздной алеі, каштанавая, дубовая, таполевыя прагулачныя сцежкі. Парк занядбаны, патрабуе дагляду, гаспадарскага выкарыстання і ўзяцця пад ахову дзяржавы.

[1]*Фота аўтара. 1999г.*

# Паланэчка
# Połoneczka
# Полонечка

Адзін з унікальных палаца-паркавых ансамбляў. Размяшчаецца над невялікай р. Дзвеяй (Змейкай), прытокай р. Ушы. Землі маёнтку належалі ў 1428г. Ульяне Гальшанскай, жонцы Вялікага князя ВКЛ Вітаўта, затым - роду Рудамінаў-Душацкіх, а з II паловы 18 ст. да 1939 г. Паланэчка была ва ўласнасці магнацкага роду Радзівілаў.

Першым гаспадаром яе стаў князь Мацей Радзівіл (1749-1800), Кашталян Віленскі, знакаміты паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч і гарачы патрыёт Вялікага княства Літоўскага, павенчаны з Эльжбэтай з заможнага роду Хадкевічаў. Затым Паланэчкай валодалі сын Мацея - Канстанцый потым яго ўнук, таксама Мацей і сын Мацея - Альберт Станіслаў (1858 - 1927), які неўзабаве выехаў ў Амерыку, перапісаўшы сядзібу брату Уладзіславу Радзівілу (1909 г.н), павенчанаму з князёўнай Ганнай Марыяй Чартарыйскай. Яны былі самымі апошнімі гаспадарамі Паланэчкі[1].

Вядома, што ў 1777 годзе ў гасцях у Мацея Радзівіла ў Паланэчцы пабываў расійскі сенатар і знакаміты сатырык Д.Фанвізін, аўтар вядомага «Недоросля». Аб чым гаварылі тады госць з гаспадаром невядома, але можна дапусціць, што Мацей Радзівіл, як элітная асоба беларускага гаспадарства, выхаваны ў лепшых традыцыях еўрапейскай культуры, ад шчырага сэрца пачаставаў госця багатым абедам і, безумоўна, пазнаёміў з мелодыямі яго музычных твораў, якія затым увайшлі ў класіку сусветнага музычнага мастацтва.



*Мал. 28. Палачанка. Від на палац з боку пад’езду. 1876г. Фотакопія арыгіналу акварэлі Напалеона Орды.*[2]

Ансамбль уключаў палац, аранжарэю, уязную браму, млын, парк, капліцу-пахавальню.

Пабудаваны напрыканцы 18 - пачатку 19 ст. у стылі ампір, палац быў праслаўлены на ўсю Еўропу раскошай і аздобаю, багацейшай бібліятэкай, архівам і калекцыямі мастацкіх твораў і манет. Другі ўласнік палацу Канстанцый быў таксама надзвычай адукаваным чалавекам, узначальваў антыпрыгонніцкае Патрыятычнае Таварыства на Беларусі, быў звязаны з дзекабрыстамі Расіі, шмат здзейсніў для развіцця беларускай культуры.

Тройчы ваенныя ліхалецці (канец 19 ст., 1917, 1943 г.г.) наносілі вялікую шкоду і разбурэнні Паланэцкаму палацу, але ён пастаянна аднаўляўся. Цяпер у ім размешчана сярэдняя школа і пачаўся чарговы этап яго аднаўлення.

Мураваны палац мае сіметрычна-восевую кампазіцыю,

у цэнтры дамінуе двухпавярховы, амаль квадратны будынак, да якога праз галерэі далучаны квадратныя ў плане аднапавярховыя павільёны. Пазней да палацу прыбудавана аранжарэя ў стылі неаготыкі (не захавалася). Цэнтральная частка галоўнага фасаду вылучана плоскімі пілястрамі, дэкарыраваў гермамі і завершана трохвугольным франтонам (таксама не захаваўся), на тымпане якога быў ляпны герб Радзівілаў, увенчаны вянком. Безумоўна, першапачатковая планіроўка палацу значна зменена, да мінімуму спрошчана.

У бібліятэцы змяшчалася каля 4000 тамоў унікальнага кнігазбору. У капліцы меўся абразок Маці Божай, падараваны Янам III і драўляны крыжык, прывезены з іерусалімскіх храмаў у 1584г. У палацы вісеў партрэт маладога Мікалая Каперніка і 38 партрэтаў роду Радзівілаў, шмат работ вядомых мастакоў: Бацарэлы, Лампегі, Пешкі і Рустэма, а таксама шэраг габеленаў[3].



*Мал. 29. Паланэчка. Паваенны выгляд палаца.*[4]

Палац акружаў вялікі парк пейзажна-рэгулярнай планіроўкі, які складаўся з дзвюх частак. Пейзажная частка з сажалкай размешчана перад палацам на чатырох тэрасах, якія спускаліся да ракі. Верхняя тэраса па перыметры была абсаджана чорнай таполяй. На газоне перад палацам існаваў сонечны гадзіннік. Алея па падоўжанай восі палаца ішла праз парк да капліцы-пахавальні, у якой навечна спачываў заснавальнік палацу[5].



*Мал. 30. Паланэчка. Схема планіроўкі ансамблю.*[6]

Перад палацам стаялі ўяздныя вароты з вазамі, выкананыя ў стылі ампір. Палац - характэрны ўзор забудовы гістарычнага сядзібна-паркавага ансамбля з рысамі архітэктуры позняга класіцызму.

[1] *Słownik Geograficzny... T.7,1887, s. 725.*
[2] *Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (III-RA. 4491).*
[3] *Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s. 320.*
[4] *Беларускі архіў кінафотадакументаў. (Інв. № 0-119675).*
[5] *Архітэктура Беларусі..., с. 380.*
[6] *Ілюстрацыя: Кулагин А.Н. Архитектура..., с.66.*



Kamunikat.org

# Паўлікава
# Pawlinowo
# Павлиново

Добра захаваны палаца-паркавы ансамбль. Размешчаны каля вытокаў р. Качарэшкі, якая праз р. Лахазву нясе свае воды да р. Шчары.

Паводле даследавання мясцовага краязнаўцы М. Берната ў 1897 г. беларускі шляхціч Ян Отан Бохвіц набывае гэтыя землі ў Навіцкіх, спачатку плануе і размяшчае тут свае гаспадарчыя пабудовы, потым закладвае сад і разбівае пейзажны парк. На р. Лахазве будуецца вадзяны млын, непадалёку ў лесе працуе смалакурня для вырабу шкіпідару і мазуты. Крыху пазней, у 1906 г. Бохвіц закладвае падмурак багатага палаца, які завяршае ў 1909 г. На той час у маёнтку Паўлікава месцілася 7 двароў з 45 жыхарамі.

Гаспадар Паўлікава Ян Отан Бохвіц быў сынам выдатнага філосафа і пісьменніка Фларыяна Бохвіца, жанатага з Паўлінай Маеўскай, якая даводзілася роднай сястрой Барбары Маеўскай - маці славутага Адама Міцкевіча[1]. Сам Ян Бохвіц маладым афіцэрам гусарскага палка прымаў удзел у Крымскай вайне, а пасля яе заканчэння атрымаў шырокую папулярнасць у сваіх родных мясцінах сярод сялян, як гарачы прыхільнік скасавання прыгонніцтва. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні (1863-64г.) быў кінуты за краты ў Дынабургскую крэпасць. Пасля году турмы шчыра ўзяўся за працу па аднаўленні разбураных уласных сядзіб. Спачатку адбудаваў зруйнаваны палац каля в. Вашкаўцы (Ураджайная), што пад Ляхавічамі, і назваў яго імем бацькі - Фларыянавым, а пры закладцы новага палаца-паркавага ансамбля на р. Качарэшцы, назваў яго імем сваёй маці - Паўлінавым. На сённяшні дзень як у Фларыянаве, так і Паўлінаве захаваліся арыгінальныя і падобныя ў многім палацы.

Паўлінаўскі палац мае 3 паверхі, будынак па форме прамавугольны, трэці паверх мансардны. Усе чатыры фран-



Kamunikat.org

тоны трактаваны ў стылі неаготыка завершаны зубчатымі вежкамі.

Дзякуючы таму, што пасля вайны да 1990-х гадоў ансамбль выкарыстоўваўся ў якасці ваеннага шпіталю, ён не стаў ахвярай разбурэння.

Асабліва добра захаваўся пейзажны парк. Ён займае плошчу да 7 га, мае форму квадрата, прыгожую сажалку, якая атрымала назву Паўлінаўскае возера. Існуюць некалькі баскетаў, раздзеленых шэрагам ліпавых, дубовых, таполевых алеяў і сцежак, акружаных кустарнікавым жываплотам, туяй,



*Мал. 31. Паўлікава. Сучасны выгляд бакавога і цэнтральнага фасадаў палаца.*[2]

клёнам, грабам і іншымі пародамі дрэваў.

На сёння Паўлінаўскі палаца-паркавы ансамбль прадстаўляе цікавасць як гаспадарчы аб’ект, у якім можна размясціць турыстычна-гасцінічны комплекс альбо санаторную школу для дзяцей.

[1] *Мысліцелі і асветнікі Беларусі X-XIX стагоддзяў. Мн., 1995, с. 375.*
[2] *Фота аўтара. 1998 г.*

# Савічы
# Sawicze
# Савичи

Колішні палаца-паркавы ансамбль. Да 16 ст. належаў спачатку да князёў Алелькавічаў, адной са старадаўніх лініяў ад князёў Альгердавічаў. Дачка Ежы (Юрыя) Алелькавіча (1559 - 1586) і Барбары з роду Кінікаў - Сафія выйшла замуж за князя Януша Радзівіла і з таго часу велізарны маёнтак перайшоў да Радзівілаў.[1]

Савічы разам з маёнткам Пузавым, шэрагам фальваркаў, сядзіб і хутароў мелі на той час каля 5000 дзесяцін зямлі. Усё гэтае багацце выкупіў род Талышэўскіх. Уласніца яго - Анна Талынэўская, якая тройчы выходзіла замуж, спачатку за Трыпальскага, затым за Людвіка Вайніловіча і, нарэшце, за Рэйтана, усё ж перапісала маёнтак на дзяцей ад Вайніловіча. С таго часу (1661 г.) да 1921г. Савічы заставаліся



*Мал. 32. Савічы. Агульны выгляд палаца. 1876 г. Фотакопія арыгіналу акварэлі Напалеона Орды.[2]*

радзінным гняздом лініі Вайніловічаў гербу Сыракомля. На працягу 19 ст. Савічы з Пузавым належалі да Антонія Вайніловіча, Слуцкага маршалка (1812 г.), затым яго сына Адама (1816-1874) і ўнука Эдварда (1847-1928) - фундатара раскошнага Мінскага касцёлу.

Напачатку 19 ст. у Савічах стаяў старадаўні (17 ст.) драўляны дом з ламаным дахам і дзвюма вежкамі. На яго месцы Антоній Вайніловіч узвёў новы мураваны і вельмі прыгожы палац. Адначасна ім праведзена аднаўленне старога парку, высаджаныя ліпавыя альтанкі для аркестру, усталяваныя галандскія ветракі, гроты і лабірынты, як у парках Альба (пад Нясвіжам) і Аркадзія (пад Варшавай)[3].



*Мал. 33. Савічы. Выгляд палаца ад фронту да 1917 г.[4]*

Новы палац выглядаў на фоне тыповых правінцыйных сядзіб надзвычай прывабна і нетрадыцыйна. Асноўны корпус у плане прамавугольны, двухярусны, з падвышаным па цэнтру галоўнага фасаду рызалітам на трох аркадах. Рызаліт завершаны трохкутным шчытком, аздобленым кансолевым карнізам і барэльефным родавым гербам. Унутранае ўбранства палаца таксама было вельмі багатае: залы і калідоры ўпрыгожвала галерэя партрэтаў асобаў з роду Вайніловічаў з 17 ст., пісаных невядомым мастаком. Асаблівую вартасць для гісторыкаў уяўляў пакой сямейнага архіву, дзе захоў-

валіся дакументы II пакаленняў Вайніловічаў. Акрамя багатага архіву, у бібліятэцы было сабрана больш за 5000 кніг, апрацаваных і ўнесеных у каталог.

Перад фронтам і тылам палаца цягнуліся даволі вялікія газоны, абсаджаныя дэкаратыўным кустарнікам. Пад'езд да галоўнага ўваходу быў выбрукаваны каменнем. Па абодва бакі ўваходных дзвярэй стаялі 4 гістарычныя гарматы. На левым баку галоўнага корпусу месцілася ніжэйшая за яго афіцына. Гэтыя будынкі акружаў старадаўні парк, дрэвы якога былі равеснікамі продкаў Алелькавічаў. У парку яшчэ



*Мал. 34. Савічы. Выгляд палаца з боку парку да 1917г.*[5]

напачатку XX ст. меліся колішнія лабірынты і гроты. На ўскрайку парку быў курган, парослы дубамі і бярозамі, у якім спачылі навечна продкі ўласнікаў маёнткаў Савіч і Пузава. У часы I сусветнай вайны палац быў моцна разбураны і больш не аднаўляўся.

[1]*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.1477, воп.1, спр. 1882.*
[2] *Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (III-RA. 4497).*
[3] *Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s. 346 349.*
[4] *Ілюстрацыя: Aftanazy R. Dzieje rezydencji..., s.346.*
[5] *Ілюстрацыя: тамсама с. 347.*

# Сачыўкі
# Soczywki
# Сочивки

Колішні сядзібна-паркавы ансамбль, які размешчаны непадалёку ад в.Сталавічы. З'яўляецца радзінным гняздом продкаў Ігната Дамейкі, актыўнага ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1831 г. на Беларусі, сябра Адама Міцкевіча. У 1884 г. Ігнат Дамейка вярнуўся з Чылі на Беларусь і разам са сваім сябрам паэтам Антонам Эдуардам Адынцом наведалі маёнтак Сачыўкі, дзе спачывалі навечна яго маці, бабуля і ўсе продкі. У сваім нарысе «Мае падарожжы» Дамейка падрабязна распавядае пра Сачыўскі двор.[1]

Спачатку двор належаў бабулі Ігната Дамейкі Анцуце з Валадкевічаў. На той час (пачатак 19 ст.) гэта быў багаты маёнтак, меў раскошны палац. Цяпер на гэтым месцы з незапамятных часоў узвышаецца магутны дуб, аб якім ўпамінае Дамейка.

Пазней, пасля смерці бабулі, двор перайшоў у рукі дзядзькі Ігната - Станіславу, потым да маці Дамейкі, якая памерла ў 1831 г. У сярэдзіне 19 ст. быў узведзены новы дом з ганкам, двума пакоямі, спальняй, гасцёўняй, сталоўкай.



*Мал. 35. Сачыўкі. Дуб на месцы колішняга палаца.*[2]

Перад палацам размяшчаўся кветнік з клумбамі. Непадалёку на пагорку стаяла невялікая капліца. Разам з новым палацам быў закладзены вялікі парк плошчай каля 10 гектараў. Ад колішняга маёнтку засталася афіцына, рэшткі гаспадарчых збудаванняў (свіран, склеп). Парк добра захаваны. Аснову дрэвастою складаюць дубы, каштаны, ліпы, грабы і іншыя мясцовыя пароды. Па перыметры існуюць прагулачныя ліпавыя алеі.



*Мал. 36. Сачыўкі. Будынак колішняй афіцыны.*[3]

Частка парку занята старым пладовым садам. Гістарычны парк мае мемарыяльнае значэнне, патрабуе ўзяц-



*Мал. 37. Сачыўкі. Руіны склепа.*[4]

ця на ўлік і пад ахову дзяржавы. З'яўляецца перспектыўным пры правядзенні рэстаўрацыі.

[1] *Філаматы і філарэты. Мн., 1998, с.317 -322.*
[2.3.4] *фота аўтара. 1999 г.*

# Вялікая Сваротва
# Swarotwa
# Большая Своротва

Колішні палаца-паркавы ансамбль. Паводле асобных крыніц сядзіба ў 18 ст. належала да роду Юдзіцкіх. Гэта быў старадаўні беларускі род, які яшчэ ў другой палове 16 ст. атрымаў ад караля Рэчы Паспалітай Зігмунта Аўгуста вялікія надзелы зямлі ў Мінскім ваяводстве і там асеў назаўжды.

У 1765 г. Антон Юдзіцкі, сын Міхаіла кашталяна Мінскага, які не меў уласных нашчадкаў, запісаў Сваротву

адной са сваіх сясцёр Барбары, замужняй за Казімірам Тызенгаузам - Дземянтоўскім старастам. Але другая сястра Антона, жонка Крыстафора Пузыны, выказала яму нязгоду, і ў выніку разладу маёнтак быў распрадацы. Напачатку 19 ст. уласнікам Сваротвы становіцца род Незабытоўскіх, спачатку сын Якуб, жанаты на Францішцы Кунцэвіч, затым іх сын Стэфан - маршалак Гродзенскай губерні. Ад Стэфана двор пераходзіць яго дачцэ Марыі, замужняй за графам Патоцкім, якая запісала сядзібу свайму ўнуку Уладзіславу. Уладзіслаў Патоцкі быў апошнім уласнікам Сваротвы да 1939 года[1].



*Мал. 38. Сваротва. Агульны выгляд колішняй рэзідэнцыі Незабытоўскіх. 1876 г. Фотакопія арыгіналу акварэлі Напалеона Орды.[2]*

У першай палове 19 ст. Якуб Незабытоўскі ўзвёў у Сваротве вельмі прыгожую рэзідэнцыю. У 1917 годзе палац быў спалены і з таго часу не змог адбудавацца.

Палаца-паркавы ансамбль уключаў палац, флігель, гас-



kamunikat.org

падарчыя пабудовы, парк з элементамі рэгулярнай і пейзажнай планіроўкі, аранжарэю, альтанкі, каналы, масткі і інш. Цэнтральная частка ансамбля - двухпавярховы прамавугольны ў плане мураваны палац, выкананы ў стылі ампір. Будынак быў накрыты вальмавым дахам, над якім узвышаўся прамавугольны ў плане бельвэдэр (пляцоўка зверху будынку для абгляду наваколля). Сцены першага паверху былі аздоблены рустам, цэнтральную частку галоўнага фасаду вылучаў неглыбокі рызаліт з параднай лесвіцай і парталам уваходу, завершаным плоскім сандрыкам. Паводле малюнка Напалеона Орды справа ад палацу размяшчаўся мураваны двухпавярховы прамавугольны ў плане флігель пад вальмавым дахам, злева - аранжарэя[3].

Паміж палацам, афіцынай і аранжарэяй месціўся адкрыты вялікі газон. З астатніх трох бакоў усе будынкі рэзідэнцыі ахінаў вялікі пейзажны парк, рэшткі якога захаваліся да сённяшняга часу.

[1] *Aftanazy Я.. Dzieje rezydencji...,s. 369-370.*
[2]*Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (III-RA. 4507).*
[3] *Архітэктура Беларусі..., с.429.*

# Стайкі
# Stajki
# Стайки

Палаца-паркавы ансамбль, размешчаны над р.Нейкай, прытокай Дзвеі (Змейкі). Даўняя сядзіба адной з ліній роду Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна - знакамітага расійскага пісьменніка.[1] Перад II сусветнай вайной сядзіба належала роду Лашкевічаў.

Ансамбль складаўся з палаца, парку, вазоўні, стайні, аранжарэі, розных гаспадарчых збудаванняў.
Мураваны палац быў закладзены ў другой палове 19 - пачатку 20 ст. Будынак нясе ў сабе элементы эклектыкі, а таксама замкавую форму. Асацыяцыі са старажытным замкам выклікае даволі высокая гатычная вежка, размешчаная на



*Мал. 39. Стайкі. Сучасны выгляд палаца.*[2]

левым баку палаца. Палац мае два паверхі, у плане прамавугольны. Цэнтральная частка галоўнага фасаду акцэнтавана неглыбокім рызалітам, завершаным дэкарыраваным шчытком. Цэнтральны ўваход вылучаны парадным ганкам з тэрасай.

Палац акружаны пейзажным паркам, які мае плошчу каля 3 га. Маюцца прагулачныя алеі з каштану, ліпы, грабу.

Захаваўся шэраг гаспадарчых пабудоў. Водная сістэма каналаў абмялела і страціла колішні выгляд.

Пасля перасялення мясцовай школы ў новы будынак палац знаходзіцца ў занядбаным стане, патрабуе аднаўлення і гаспадарскага выкарыстання.

[1] *Słownik Geograficzny... T. II, 1890, s. 176.*

[2] *Фота аўтара. 1999г.*

# Развадова (г. Баранавічы)
# Rozwadowo
# Розводово

Да паўстання 1863-64 гг. землі маёнтку Баранавічы належалі заможнаму роду Наркевічаў. За ўдзел у паўстанні царскі ўрад секвесціруе зямлю ў Наркевічаў і іх набывае расійскі генерал Гарноўскі. У 1876 г. Гарноўскі вымушаны прадаць маёнтак. Новым уласнікам баранавіцкіх земляў становіцца маскоўскі купец Ягор Кузняцоў. У 1881 г. маёнтак купляе графіня Л. А. Развадоўская. На парожніх землях маёнтку, якія прылягалі з поўдню да чыгуначнай станцыі, Развадоўская заснавала мястэчка. У 1884г. план забудовы мястэчка зацвярджаецца Мінскім генерал-губернатарам Пятровым[1]. Па хадайніцтве графіні мястэчка атрымала адпаведны статус і назву Развадова. На карце сённяшняга горада - гэта раён паміж вуліцамі Савецкая, Калініна, Камсамольская і Брэсцкая. Пэўную частку зямлі Развадоўскія не здавалі ў арэнду, а выкарыстоўвалі для ўласнай забудовы.



*Мал. 40. Баранавічы. План забудовы м. Развадова. 1884г.*[2]

Kamunikat.org

Да 1939 г. род Развадоўскіх меў шэраг фамільных дамоў. Адзін з іх захаваўся ў добрым стане і размяшчаецца сёння па вул. Камсамольскай, 46. У ім зараз працуе банкаўская ўстанова.



*Мал. 41. Баранавічы. Сучасны выгляд колішняга палаца Развадоўскіх (вул. Камсамольская, 46)*[3]

[1] *Цэнтральны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбургу. Фонд.1287, воп. 38, спр. 3553; Архіў Баранавіцкага краязнаўчага музея, фонд 4640, л.15,16.*

[2] *Ілюстрацыя: тамсама*

[3] *Фота аўтара. 1999г.*

## Стары парк (Лесапарк) г. Баранавічы
## Stary Park
## Старый парк

Парк культуры і адпачынку. Размешчаны непадалёку ад цэнтра горада ў раёне мясакансервавага камбіната.

Напачатку XX ст. тут размяшчаўся лесапарк з натуральным дрэвастоем. У працэсе забудовы горада частка ле-



Kamunikat.org

салярку ўвайшла ў гарадскую мяжу і была захаваная. Асноўную масу дрэвастою складаюць сосны, ёлкі, бярозы, клёны, таполі і іншыя мясцовыя пароды.



*Мал. 42. Баранавічы.*
*Від па цэнтральную алею старага парку.*[1]

У парку не існуе гістарычных архітэктурных збудаванняў. Парк мае плошчу 5,5 га, цэнтральную алею і некалькі бакавых сцежак.

У перспектыве парку патрэбна аднаўленне і рэканструкцыя.

[1] *Фота аўтара. 1999г.*

## Вялікае Сяло
## Wielkie Sioło
## Великое Село

Старажытнае ўмацаванае гарадзішча. На сённяшні дзень яго тэрыторыя практычна не абследавана і грунтоўна не вывучана. Размяшчаецца на захад ад вёскі Вялікае Сяло (1 км) у так званым урочышчы Маяк поруч з балотам.[1]

Памеры гарадзішча складаюць 90 х 80 м. Вышыня валу дасягае 7 м. Гарадзішча ахінае безназоўны ручай. Па сцверджанні мясцовых старажылаў гарадзішча было моцна пашкоджана ў гады II сусветнай вайны, а пры савецкай уладзе ва ўсходняй частцы пляцоўкі распрацаваны кар’ер і валы не захаваліся, а ўся пляцоўка зарасла дрэвамі.



*Мал. 43. Вялікае Сяло. Рэшткі ўмацавання.*[2]

По меркаванні асобных даследчыкаў (Т.Бубенька, В.Супрун і інш.) гарадзішча ў старажытныя часы выконвала ролю ўмацаванага сховішча ад варожых набегаў.[3]

Гарадзішча мае статус помніка, узята на ўлік і пад ахову дзяржавы.

[1] *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.1477, воп.1, спр. 1876.*
[2] *Фота М.Берната. 1990 г.*
[3] *Збор помнікаў..., с. 79-80.*

# Трацэвічы
# Tracewicze
# Троцевичи

Колішняя сядзіба. Размяшчалася паміж Радзівілаўскай Паланэчкай і Верашчакаўскімі Туганавічамі. Належаў двор да вялікай групы дробных правінцыйных сядзіб, якіх было шмат на Беларусі.

Спачатку дваром гаспадарыў Эдвард Паўловіч, які вымяняў Трацэвічы сярод іншых маёнткаў. Пазней па спадчыне сядзіба адышла да роду Рымшаў. У другой палове 19 ст. сядзіба пераходзіць да Францішка Прыходзькі, а пасля яго смерці - дачцэ Марылі, замужняй за Браноўскім. Апошнім гаспадаром Трацэвіч быў іх сын Вітольд Бранеўскі.[1]

Можна сцвярджаць, што гаспадары з роду Рымшаў напачатку 19 ст. узвялі ў Трацэвічах невялікі палацык з элементамі класіцызму. Будынак меў шмат падабенства з Туганавіцкай сядзібай і агульны лёс. І той і другі былі знішчаны ў часы І сусветнай вайны.

З фотакарткі 1914 года можна ўбачыць, што будынак меў даволі простае архітэктурнае аблічча.

Аднапавярховы палац быў у плане прамавугольны, накрыты гладкім чатырохсхільным гонтавым дахам з дзвюма парамі сіметрычна размешчаных комінаў.



*Мал. 44. Трацэвічы. Выгляд палаца ад фронту да 1914 г.*[2]

Да цэнтральнага фасаду далучаўся порцік на дзвюх парах калонаў, на якія абапіраўся трохкутны шчыток з шырокім акенцам. Пазней шчыток быў перароблены, а калоны сталі больш прысценнымі. Усе фасады будынку пакрыты гладкай тынкоўкай. Прамавугольныя вокны мелі даволі вялікія памеры. Аб унутраным выглядзе палацу ніякіх пакуль звестак не знойдзена.

Вядома, што Трацэвічы былі цесна звязаны з асобай Адама Міцкевіча. У часы сваіх доўгіх вандровак па наваколіцах Туганавіч ён не адзін раз наведваў суседнія Трацэвічы. Паміж Туганавічамі і Трацэвічамі нават існавала так званая «горка Міцкевіча», на якой паэт вельмі любіў адпачываць.

Маёнтак Трацэвічы ў свой час разам з донкай, лесам, балотам складаў больш за 400 гектараў.

1 *Aftanazy R.. Dzieje rezydencji...,s. 385.*

2 *Ілюстрацыя: тамсама.*

# Туганавічы
# Tuhanowicze
# Туганoвичи

Знакаміты палаца-паркавы ансамбль. Размяшчаўся каля в. Карчова на р. Сэрвач. Некалі быў радзінным гняздом князёў Туганаў. Назва маёнтку, безумоўна, мае татарскае паходжанне. На карысць гэтаму сведчаць пазначаныя ў дакументах 1566 і 1570 гадоў урочышчы Ардынка (Ардынцоўшчына), Татараўшчына, а таксама «Гай альховы за татарамі», што размяшчаліся ў наваколлі Туганавіч.

На старонках пісьмовых крыніц Туганава ўпершыню ўпамінаецца падчас праўлення Вялікага князя ВКЛ Казіміра (1440-1492). Пры Жыгімонце І Туганавіцкі двор быў ва ўласнасці роду Масальскіх. У 16-17 ст. сядзіба належала некалькім гаспадарам: Данэйкам, Нарніцам, Касцяніцам, Туганаўцам, Трызнам, Азарычам.

Напачатку 18 ст. Адам і Юзэф Туганаўскія прадаюць маёнтак свайму сваяку Станіславу, потым сядзіба пераходзіць да яго сына Казіміра, які прадае вялікую частку Туганавіч Ігнату Вішнеўскаму. У сярэдзіне 18 ст. двор стаў уласнасцю роду Верашчакаў, якія паходзілі з Кобрынскай зямлі. Каля 1840 г. старэйшая дачка Юзэфа Верашчакі Сафія (сястра Марылі) выйшла замуж за Канстанцыя Туганаўскага і сядзіба зноў апынулася ва ўласнасці старадаўняга роду Туганаўскіх. Апошняй уласніцай Туганавіч была Юзэфа Туганаўская, якая запісала маёнтак сялянскаму Таварыству з умовай пабудовы пры двары сельскагаспадарчай школы[1].



*Мал. 45. Туганавічы. Агульны від на палац і афіцыну.1876г. Фотакопія арыгіналу акварэлі Напалеона Орды.[2]*

У 1815 - 1820 г.г. Туганавіцкімі гасцямі часта былі Адам Міцкевіч, Томаш Зан, Ян Чачот, Ігнат Дамейка. Лета 1818 г. у Туганавічах прайшло пад знакам рамантычных і палымяных пачуццяў дачкі гаспадыні маёнтку - Марылі Верашчакі

і маладога Міцкевіча. Трагічная гісторыя гэтага кахання зрабіла вялікі адбітак у творчасці славутага паэта. Пройдзе час, Міцкевіч раскіне свае магутныя паэтычныя крылы, але ніколі не забудзе гэты беларускі куточак прыроды і зямлі, а пазней напіша «...і вечна сняцца мне Наваградак і Туганавічы»[3]. Як сцвярджаюць даследчыкі, апісанне ў паэме «Пан Тадэвуш» м. Сапліцова цалкам адпавядае тапаграфіі Туганавіцкай сядзібы. Паводле малюнкаў У. Дмахоўскага (1861), Напалеона Орды (1876), а таксама паводле фотаздымкаў Я. Булгака, Т. Барэцці і К. Карповіча (пач. XX ст.) вядома, што ў параднай частцы парку быў размешчаны невялікі палац з рысамі позняга класіцызму. Дом меў мансарду і тэрасу на чатырох слупах, флігель з мураваным ганкам і



*Мал. 46. Туганавічы. Від на бярозу Адама Міцкевіча і капліцу - пахаваньню роду Туганаўскіх. 1861г Фотакопія арыгіналу акварэлі У.Дмахоўскага.*[4]

аранжарэю. Кароткая ўязная алея вяла да сядзібных пабудоў. У паўднёва-заходняй частцы парку на ўзгорку размяшчалася капліца-пахавальня (разбураная ў 1914 г.), абсаджаная па перыметры дубамі. У цэнтры парку пры асноўнай алеі знаходзілася альтанка (так званая «калыска кахання» Марылі і Адама, на жаль, не захавалася) пад шасцю векавымі ліпамі (цяпер ліпы сталі гістарычнымі). У парку налічваецца каля 40 пародаў дрэваў, у т.л. шэраг экзатычных.

Туганавіцкі парк лічыцца класічным узорам пейзажнай паркавай архітэктуры перыяду рамантызму. Ён размешчаны на ўзгорыстай мясцовасці і займае плошчу каля 8 гектараў. Асноўныя элементы кампазіцыі - паляны з курцінамі і далёкімі перспектывамі навакольнага ландшафту. У паўднёва-ўсходняй частцы знаходзяцца дзве сажалкі, а ва ўрочышчы Кут у лясным масіве ляжыць валун - «камень філарэтаў», каля якога А. Міцкевіч, яго сябры Т. Зан, Я. Чачот, І. Дамейка, Ю. Яжэўскі, Ф. Малеўскі і інш. беларускія вольнадумцы давалі клятву адданасці ідэалам свабоды, братэрства і незалежнасці. З Туганавічамі звязаныя асобныя падзеі нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863-64 г.г.[5] Уладальнік



***Мал. 47. Туганавічы. Схема планіроўкі ансамблю.***[6]

маёнтку Канстанцый Туганаўскі падтрымліваў цесныя сувязі з Кастусём Каліноўскім, дапамагаў яму ў рэвалюцыйнай дзейнасці. У сядзібе працавала майстэрня па вытворчасці зброі для паўстанцаў, якая перапраўлялася ў цэнтр паўстання Мілавіды. Пасля падаўлення паўстання Канстанцый Туганаўскі быў арыштаваны і замардаваны ў Віленскай турме.

Палац быў знішчаны ў першую сусветную вайну.

Туганавіцкі парк мае мемарыяльнае значэнне. У перспектыве плануецца яго аднаўленне.

*[1] Rąkowski G. Ilustrowany przewodnik... s.250.*

*[2] Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (III-R.A. 4508).*

*[3] Федарук А.Т. Садово-парковое искусство..., с.121.*

*[4] Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея (III-R. A.)*

*[5] Габрусь Т.В.і інш. Страчаная спадчына..., с.223.*

*[6] Збор помнікаў..., с.84.*

## Верхняе і Ніжняе Чэрніхава
## Czernichowo
## Верхнее и Нижнее Черниховo

Палаца-паркавы ансамбль. Захаваўся часткова толькі парк, які быў закладзены ў другой палове XIX ст. Спалучаў невялікую пейзажную частку, фруктовы сад, гаспадарчы двор і сажалкі за межамі паркавай зоны. Адрозніваецца кампактнасцю і дакладнай агульнай арганізацыяй паркавай прасторы. Цэнтрам кампазіцыі быў палац, размешчаны ў глыбіні парку.

На самым высокім месцы над схілам ўзвышша знаходзіцца партэрны ўчастак, які мае выгляд адкрытай пляцоўкі дыяметрам да 60м. За палацам размяшчалася пейзажная частка парку, моцна зарослая кустарнікам. З рэдкіх раслін тут растуць ліпа амерыканская, лістоўніца еўрапейская. На жаль, у 1980 г. тут знік адзін з лепшых у Беларусі экземпляраў вяза голага Кампердоўна.Усяго ў парку налічваецца каля 25 дрэвавых відаў.



kamunikat.org

Цэнтральная традыцыйная алея адсутнічае, па перыметры парк акружаюць ліпавая і каштанавая алеі разам з валам і каналам, абсажаных пасадкай караганы.

Каля палаца стаяла невялікая цагляная вежа, а на ўездзе ў сядзібу існавала мураваная каплічка[1].




**Мал. 48. Схема парку ў Верхнім Чэрніхаве.[2]**

Палац не захаваўся. Гістарычны парк мае перспектыву пры належных да яго аднаўлення адносінах.

У в. Ніжняе Чэрніхава таксама захаваўся фрагмент некалі раскошнага гістарычнага парку з шэрагам каштоўных відаў дрэў, якія могуць выкарыстоўвацца для збору насення і нарыхтоўкі чаранкоў.

*[1] Федорук А.Т. Садово-парковое искусство..., с.224-225.*
*[2] Ілюстрацыя: тамсама.*

## Ястрэмбель
## Jastrzembiel
## Ястрембель

Палаца-паркавы ансамбль. Размешчаны ў жывапісным месцы на беразе р. Мышанкі. Напачатку 19 ст. сядзіба стала спадчынным гняздом Катлубаяў[1], род якіх мае татарскае

паходжанне. Першым вядомым уласнікам Ястрэмбеля быў Міхаіл Катлубай, які служыў рахункаводам пры Радзівілаўскай Камісіі, затым гаспадаром сядзібы стаў сын Міхаіла - паручнік Генрых Катлубай, які атрымаў сядзібу ў 1864 г. Разам з Генрыхам маёнткам валодаў і яго старэйшы брат - вядомы гісторык Эдвард Катлубай, які нарадзіўся ў Вільні ў 1822 г. За ўдзел у паўстанні 1863-64 г. у Катлубаяў быў сканфіскаваны адзін з маёнткаў у Трокскім павеце. Пасля Эдварда палацам валодаў яго сын Генрых, удзельнік руска-турэцкай вайны, вядомы ваенны доктар. Апошнімі гаспадарамі да прыходу савецкай улады былі сыны Генрыха - Міхаіл і Эдвард[2]. Ансамбль уключаў мураваны палац, пабудаваны ў 1897 г., парк, капліцу, бровар, канюшню, вазоўню і іншыя гаспадарчыя аб’екты.



*Мал. 49. Ястрэмбель. Сучасны выгляд палаца ад фронту.*[5]

Палац мае форму асіметрычнага ступеньчатага збудавання. Вертыкальнай дамінантнай з’яўляецца чатырохярусная шатровая вежа. Аснова кампазіцыі - двухпавярховы

будынак палацу, да якога далучаны рознавялікія аб’ёмы. Галоўны фасад выдзелены неглыбокім рызалітам на двух вялікіх слупах. Да параднага ўваходу вядзе двухбаковы пандус з балюстрадай. З дваровага фасаду будынак ахінае тэраса. Фасады апрацаваныя рустам, карнізамі з сухарыкамі, аконныя праёмы дэкарыраваны пілястрамі, налічнікамі, разеткамі, што надае палацу прывабны выгляд і асаблівую арыгінальнасць[3].

Палац і яго гаспадарчыя збудаванні акружаны невялікім пейзажным паркам перыяду эклектыкі. Парк займае роўную, злёгку паніжаную, прамавугольную тэрыторыю плошчай 6 гектараў. Да парку далучаны фруктовы сад. Уязная кляновая алея вельмі шырокая (10 м), яе дрэвы высаджаны праз чатыры метры. Яна ішла перпендыкулярна асноўнай




*Мал. 50. Ястрэмбель. Схема планіроўкі ансамблю:*
*1. Палац; 2. Свіран; 3. Стайня.*[6]

восі кампазіцыі, перасякаючы ўсю сядзібу. Уезд фіксаваны варотамі, да якіх быў далучаны будынак канюшні (разбураны). За ўсходняй параднай часткай сядзібы размешчана

штучная сажалка. Вось перспектывы ад палаца падкрэслена парай куліс з белай тапалі. Па перыметры сажалкі раслі вербы плакучыя, а перад домам захаваліся адзінкавыя старыя дрэвы мясцовых відаў. Заходняя частка парку перапланавана ў рэгулярным стылі.[4]

Сажалка парку мела не толькі планіровачна-дэкаратыўнае значэнне, але і была акумулятарам вільгаці, прымаючы ваду па бакавым каналам. Лішкі вады па цэнтральным канале сцякалі ў р. Мышанку. Водная сістэма сёння парушаная, каналы абмялелі. Парк у значнай ступені відазменены. Тут пабудавана шмат новых будынкаў школы-інтэрната, у выніку чаго палац прыйшоў у занядбаны стан. У сучасны момант пачата яго аднаўленне.

[1] *Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф.1477, воп.1, спр. 2067.*

[2] *Белы А. Што пакінем нашчадкам? // Дыялог. 1997, чэрвень №6 (39), с.12.*

[3] *Rąkowski G. Ilustrowany przewodnik..., s. 94.*

[4] *Федору к А.Т. Садово-парковое искусство..., с. 191.*

[5] *Фота М.Берната. 1998г.*

[6] *Ілюстрацыя: Свод памятников..., с.110.*

# Ясянец
# Jasieniec
# Ясенец

Старадаўняя сядзіба. Паводле сцверджання шэрагу даследчыкаў[1] у ёй нарадзіўся Яўхім Храптовіч (04.01.1729 - 04.03.1812), выбітны дзяржаўны і грамадскі дзеяч Беларусі, апошні канцлер Вялікага княства Літоўскага пры апошнім каралі Рэчы Паспалітай Станіславе Аўгусце Панятоўскім. Храптовіч быў заснавальнікам вядомай Шчорсаўскай бібліятэкі, стваральнікам Адукацыйнай камісіі - першай у Еўропе дзяржаўнай установы, якая пачала сістэмна і мэтанакіравана займацца народнай асветай.

Сядзіба была размешчана ў маляўнічай мясцовасці на захад ад Паланэчкі над р. Сэрвеч. Некалі ўваходзіла ў склад уласных зямель Панятоўскіх, а ў 19 - першай палове 20 ст. перайшла ў спадчыну Верашчакаў - роднаму брату Марылі Верашчакі - Міхаілу.

Да I сусветнай вайны Верашчакі жылі ў старадаўнім мураваным сядзібным доме, сярэдняя цэнтральная частка якога была ўзведзена, магчыма, яшчэ ў 18 ст., а іншыя памяшканні ўзніклі значна пазней.

Будынак дома ў плане прамавугольны, трохвосевы, на нізкім падмурку, меў ад фронту даволі вялікі порцік на дзвюх парах масіўных калонаў. Калоны са стылізаванымі капітэлямі неслі гладкі антаблемент і трохвугольны франтон, акантаваны карнізам, з невялікім шчытком, прабітым вузкім светлавым акенцам.



*Мал. 51. Ясянец. Выгляд палаца ад фронту да 1914г.*[2]

Да цэнтральнага будынка былі дабудаваны кутавыя памяшканні, завершаныя двухсхільным дахам з аналагічнымі невялікімі шчыткамі.

Фасады палаца не мелі якіх-небудзь дэкаратыўных элементаў. Да тыльнай часткі галоўнага будынка была дабудавана тэраса. Сярэдняя частка накрыта высокім чатырохсхільным гонтавым дахам з двума сіметрычна размешчанымі комінамі. На правым баку палацу стаяў аднапавярховы будынак афіцыны з высокім дахам, накрытым гонтай. Пасля II сусветнай вайны палац быў разбураны.

Палац акружаў вялікі пейзажны парк, у асноўным, з мясцовых парод дрэваў. Рудыменты парку захаваліся да сённяшняй пары. Парк мае мемарыяльнае значэнне і патрабуе ўзяцця на ўлік і пад ахову дзяржавы.

[1] *Aftanazy R.. Dzieje rezydencji...,s. 226.*

[2] *Ілюстрацыя: тамсама.*

# Заключэнне

Кожны палац, парк, сядзіба і замак маюць сваю гісторыю. Былі ў гісторыі палаца-паркавага мастацтва перыяды росквіту, высокай культуры і заняпаду.

Але якая б ні была гэтая гісторыя і яе вынікі, мы павінны добра зразумець, што гэта Беларуская гісторыя, што мы выйшлі з яе, а таму павінны яе шанаваць, аберагаць і вывучаць.

Усе, што мы маем, што атрымалі ў спадчыну (добрае і чыстае, зняважанае і апаганенае) павінна служыць паказальным прыкладам выхавання, каб зноў не апынуцца ў бяспамяцтве ды не стаць бязродным манкуртам сваёй Бацькаўшчыны.

Хараство колішніх паркаў і сядзіб, палацаў і ансамбляў выхоўвала ў людзей светлыя пачуцці, патрыятычную ўспламянёнасць, грамадзянскую свядомасць, служыла ідэалам дабра і гонару за сваю Айчыну, высокую адказнасць і ахвярнасць за яе будучыню і лёс.

Таму вяртанне колішніх гістарычных палацаў і паркаў да новага жыцця з’яўляецца высакароднай справай не толькі ўлады, грамадскіх арганізацый, але і кожнага сумленнага і культурнага чалавека.

***

Кніга выйшла ў свет дзякуючы дабрачыннасці яе асноўнага фундатара - вытворчага прадпрыемства «Саюзтэхсэрвіс» і яго Генеральнага дырэктара Алега Клімовіча.

Аўтар шчыра ўдзячны за дапамогу ў зборы гістарычных звестак і каштоўныя парады Варшаўскаму Цэнтру аховы гістарычных ландшафтаў (дырэктар д-р Анжэй Міхалоўскі), Кракаўскаму нацыянальнаму музею, Варшаўскаму Фонду Тадэвуша Касцюшкі (прэзідэнт д-р Марэк Лешэк Кшэшняк), прафесійным работнікам аховы матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Брэстчыны Міхасю Бернату, Станіславу Шчарбакову з Баранавіч, іншым прыхільнікам нацыянальна-культурнага адраджэння.

kamunikat.org

# Імянны паказальнік

У імянны паказальнік вынесены прозвішчы ўсіх гістарычных і дзяржаўных асобаў, якія ўпамінаюцца ў тэкстах, а таксама аўтараў навуковых прац і даследчыкаў па дадзенай тэматыцы. Лічбы паказваюць нумар старонкі, з якой вынесена прозвішча.


Абуховіч Рэгіна - 10
Адынец Антон Эдуард - 29, 31, 51
Алелькавіч Сафія - 48
Алелькавіч Юрый - 48
Амбіноскі Т. - 20
Анціпаў Васіль - 7, 75
Афтаназы Раман - 7, 11, 14, 15,17, 22, 24, 28, 31, 33, 37, 45, 50, 55, 62, 71, 75
Ашмянскія - 12
Багрым Паўлюк - 5, 30
Бацарэла - 44
Белы А. - 70, 75
Бернат Міхась - 31, 39, 46, 60, 70
Бохвіц Фларыян - 46
Бохвіц Ян Отан- 46
Браноўскі Вітольд - 61
Брахоўская Алена - 28
Валадкевіч Анцута - 51
Валадкевіч Ганна - 10
Валовіч Казімір - 35
Валовіч Яўстафій - 37
Вайніловіч Адам - 49
Вайніловіч Антоній - 49
Вайніловіч Людвік- 48
Вайніловіч Эдвард - 49
Ваўрынчык Аліна - 7, 75
Верашчака Марыля - 20, 30, 63, 70
Верашчака Міхаіл - 70
Верашчака Сафія - 63
Вішнеўскі Ігнат - 63
Гальшанская Ульяна - 42
Галубок Уладзіслаў - 5
Габрусь Тамара - 7, 21, 66, 75
Гедройц-Юрага Станіслаў - 28
Грыцкевіч Анатоль - 7
Даманскі Януш - 35
Дамейка Ігнат -12, 29, 30, 31, 51, 63, 65
Друцкая-Горская Алена - 12
Дмахоўскі Уладзіслаў - 7, 64
Заламай Уладзімір - 6
Зан Томаш - 12, 30, 63, 65
Зданскі К. - 75
Жыгімонт П Аўгуст - 39
Каліноўскі Кастусь - 66
Каменскі Крыштоф - 12
Капернік Мікалай - 44
Карповіч - 7, 64
Катлубай Генрых - 68
Катлубай Эдвард - 68
Квітніцкая А. - 21
Кішка Барбара - 48
Клімовіч Алег- 72
Кузняцоў Я. - 57
Кулагін Анатоль - 7, 21, 45, 75
Кулеша А. - 7
Кунцэвіч Францішка - 54
Кшэшняк Марак - 72
Лей Караль - 16
Магнушэўскі - 30
Маеўская Барбара - 46
Маеўская Паўліна - 46

Малеўскі Ф. - 65
Мальдзіс Адам - 7
Масальскія- 37, 62
Маўросава Ніна - 12
Межаеўскі Мацей - 22
Міцкевіч Адам - 5, 12, 19, 20, 21, 26, 30, 46, 51, 62, 63
Міхалоўскі Анжэй - 72
Мураўёў - 12
Напалеон Банапарт - 22
Незабытоўскі Стэфан - 54
Незабытоўскі Якуб - 54
Орда Напалеон - 7, 11, 20, 48, 54, 43, 64
Панятоўскі Станіслаў Аўгуст - 70
Паўловіч Е. - 20
Паўловіч Эдвард- 61
Патоцкая Марыя- 54
Патоцкі Уладзіслаў - 54
Пац Людвік - 15
Пешка Ю. - 7, 44
Прыходзька Францішак - 61
Пузына Крыстафор - 54
Пушкін Аляксандр - 55
Пятроў - 57
Радзівіл Альберт - 42
Радзівіл Антаніна - 28, 30
Радзівіл Канстанцый - 42, 43
Радзівіл Марыя - 29
Радзівіл Мацей - 5, 28, 42
Радзівілы Нясвіжскія - 25, 26
Радзівіл Уладзіслаў - 42
Радзівіл Януш - 48
Развадоўская Л.А. - 57
Ракоўскі Г. - 7, 21, 66, 70, 76
Рудаміны-Душацкія - 42
Рустэм - 44
Рымша Андрэй - 5
Рэйтаны - 48
Рэпін Ілля - 14
Сакаловічы - 41
Святаполк-Завадскі Пётр - 29
Святаполк -Завадскі Роберт - 28
Слізень Вальдэмар - 13
Слізень Генрых - 12, 14
Слізень Іза - 13
Слізень Рафаіл - 5, 12
Слізень Ян - 12
Талынэўская Ганна - 48
Ткачоў Міхась - 7, 21, 40, 76
Трусаў Алег - 7
Трызны - 26, 62
Трыпальскія - 48
Туганаўскі Адам - 63
Туганаўскі Канстанцый - 63, 66
Туганаўскі Юзэф - 63
Тызенгаўз Казімір - 54
Чантурыя Юрый - 7, 21
Храптовіч Яўхім - 5, 70
Хадкевіч Эльжбета - 42
Хадкевіч Ян - 39
Федароўскі М.- 30
Федарук Анатоль - 7, 11, 14, 32, 66, 67, 76
Фанвізін Д. - 42
Фалат Я. - 14
Фабіянскі - 7
Тышкевіч Каміла - 12
Чаропка В. - 76
Чантурыя Юрый - 7, 21
Чартарыйская Ганна Марыя - 42
Чачот Ігнацій - 22
Чачот Ян - 30, 63, 65
Шалевіч Аляксандра - 28
Шалевіч Браціслаў - 26
Шалевіч Караль - 26
Шалевіч Томаш - 28
Шчарбакоў Станіслаў - 72
Эйсмонты - 10
Юдзіцкі Антон - 53
Яжэўскі Ю. - 65
Якімовіч Юрый - 7, 14, 25, 39, 76
Ян Казімір - 29

Бібліяграфія

1. Антипов В.Р. Паркі Белоруссии. Мн., 1975, 152 с.
2. Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993, 830 с.
3. Aftanazy Roman. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T 2. Wrocław - Warszawa - Kraków. 1992. 720 s.
4. Белы Аляксей. Што пакінем нашчадкам? //Дыялог, № 6.
5. Габрусь Т., Кулагін А. і інш. Страчаная спадчына, Мн., 1998, 352 с.
6. Гісторыя Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1994, т.2, 540 е.
7. Wawrzyńczyk Alina. Rozwój wielkiej własności na Podlasiu w 15 i 16 wieku. Wrocław, 1951, 358 s.
8. Grzegorczuk Dariusz. Dworki i pałace polskiej w byłym województwie Brzeskim. Siedlce, 1997, 160 s.
9. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2177, воп. 2, спр. 10-2532.
10. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. Мн., 1984, 368 с.
11. Katałog rysunków architektonicznych ze zbiorów Muzeum Narodowego w Krakowie. Rysunki N. Ordy. Warszawa, 1975, 480 s.
12. Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Мн., 1981, 136 с.
13. Лакотка А.І. Пад стрэхамі прашчураў. Мн., 1995, 384 с.
14. Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мн., 1975, 672 с.
15. Przewodnik po okolicach mickiewiczowskich i rejtanowskich Ziemi Nowogródzkiej. Baranowicze. 1938. 190 s.
16. Polski Słownik Biograficzny. 1979. Wrocław - Warczawa - Kraków - Gdańsk, 1979.
17. Zdański K. Przyczynki do dziejów powiatu Brzesko - Litewskiego i ziem nim objętych. Warszawa, 1936, 132 s.
18. Российский государственный архив в Санкт-Петербурге. Ф. 1287, оп.38, д.3553.
19. Rąkowski Grzegorz. Ilustrowany przewodnik po zabytkach Kultury na Białorusi.Warszawa, 1997, 320 s.

20. Rocznik Poleski. Brześć nad Bugiem, 1926, 125 s.
21. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. Мн., 1990, 424 с.
22. Słownik Geograficzny, t. 1-15, Warszawa, 1887.
23. Ткачоў М.А. Замкі Беларусі. Мн., 1977, 89 с.
24. Ткачоў М.А. Замкі і людзі. Мн., 1991, 185 с.
25. Tygodnik Ilustrowany. 1863, № 105.
26. Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1989, 248 с.
27. Цітоў А. Геральдыка беларускіх местаў. Мн., 1998, 288 с.
28. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1477, воп. I, спр. 1876, 1882, 1929, 1966, 1982, 2067.
29. Чаропка Вітаўт. Уладары Вялікага Княства. Мн., 1996, 668 с.
30. Якімовіч Ю. А. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII - XIX ст., Мн., 1978, 152 с.
31. Якимович Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI - середины XVII в. Мн., 1991,375 с.

Kamunikat.org

## Пра аўтара

Аўтар кнігі - Несцярчук Леанід Міхайлавіч, ураджэнец Гарадзечненскага краю (в. Харкі), што на Пружаншчыне, закончыў Гарадзечненскую сярэднюю школу (1962), Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (1970), Міжнародную Акадэмію гістарычных паркаў і ландшафтаў у Варшаве (1996), абараніў дысертацыю кандыдата гістарычных навук (1996). З 1992 г. працуе інспектарам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама.

У 1994 г. абраны старшынёй абласнога дабрачыннага аб'яднання па адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны «Фонд Тадэвуша Касцюшкі.»

У 1989 - 1994 гг. арганізаваў і прыняў асабісты ўдзел у аднаўленні на Бацькаўшчыне разбураных помнікаў - святыняў на былым полі бітвы 1812 г. - Гарадзечненскай Св.-Пакроўскай царквы і мемарыяльнай капліцы «Доблесным продкам 1812г.»

Напісаў асабіста і ў сааўтарстве пяць кніг і надрукаваў больш за 40 публікацыяў у рэспубліканскім і мясцовым друку па гісторыі Айчыны, іншых праблемах сацыяльнага і культурнага жыцця.

kamunikat.org



*На першай старонцы вокладкі:*
*Туганавіцкі палаца-паркавы ансамбль у 1861 годзе.*
*Фотакопія арыгіналу акварэлі У. Дмахоўскага.*
*Архіў Кракаўскага нацыянальнага музея.*

Kamunikat.org

Навукова-папулярнае выданне

Несцярчук Леанід Міхайлавіч

# Палацы, паркі, замкі Баранавіцкага раёна

## Гісторыя, стан, перспектывы

Рэдактар Л. М. Несцярчук
Камп'ютэрная вёрстка Л. А. Федзянчук
Карэктар Т. В. Качалеўская

**Набрана на наборна-выдавецкім комплексе
Брэсцкай абласной друкарні.
224013, г. Брэст, пр-т Машэрава, 75.**

**Здадзена ў набор 14.04.99 г. Падпісана да друку 25.05.99
Фармат 60х84$^{1}/_{16}$ Папера пісчая. Гарнітура «Школьная»
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 4,66. Ул.-выд. арк. 4,06.
Тыраж 1500 экз. Зак. 2904.**

**Брэсцкая абласная друкарня.
224013, г. Брэст, пр-т Машэрава, 75.
Ліцэнзія ЛВ № 15 ад 23.12.1997 г.**

Kamunikat.org